Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і Калгасніца

БЕЛАРУСІ

14 год росквіту соцыялістычнай эканомікі і культуры БССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі



Малюнак мастака ВІЕРА

№ 12

1934 г.

Совецкая Беларусь з'явілася адной з першых Совецкіх соцыялістычных рэспублік, прыняўшых удзел у стварэнні Саюза ССР і ўступіўшых у вялікі Саюз советаў

Гонар краіне, стварыўшай такіх герояў

4-га чэрвеня працоўныя БССР, а праз дзень пролетарыі чырвонай Масквы, урачыста сустракалі сл ўнага кіраўніка чэлюскінскай экспедыцыі—ОТТО ЮЛЬЕВІЧА ШМІДТА, які вярнуўся з Амерыкі пасля выздараўлення.

Праз два тыдні—19-га чэрвеня ў Маскву з другога канца Совецкага Саюза прыбыў мужны экіпаж „Чэлюскіна" і выратаваўшыя яго лётчыкі—героі Совецкага Саюза.

Паход парахода „Чэлюскін" па вялікаму Паўночнаму марскому шляху, гібель „Чэлюскіна", двухмесячны ільдзяны палон у лагеры Шмідта, выратаванне чэлюскінцаў нашымі гераічнымі лётчыкамі—гэта векапомныя, выключна яркія старонкі.

Чатыры месяцы ўся краіна напружана сачыла за весткамі з лагера Шмідта, за радыёграмамі аб становішчы лагера, аб ходзе выратоўчых работ, аб руху самалётаў і параходаў, пасланых на дапамогу. Уся краіна пад кіраўніцтвам партыі ўдзельнічала ў выратаванні. Тав. СТАЛІН сам непасрэдна кіраваў выратоўчымі аперацыямі.

Лепшыя лётчыкі Саюза, лепшыя тэхнічныя сродкі былі кінуты ў далёкую Арктыку. Сем лётчыкаў—т. т. ЛЕВАНЕЎСКІ, ЛЯПІДЗЕЎСКІ, КАМАНІН, МОЛАКАЎ, ВАДАП'ЯНАЎ, ДАРОНІН і СЛЯПНЁЎ паказалі беспрыкладныя ўзоры гераізма і адважнасці.

Эпізод у далёкім палярным моры ператварыўся ў патрасальную па сіле эпапею. Вестка аб тым, што героі - лётчыкі вырвалі 104 чалавекі з ільдзяных абдымкаў смерці, што чэлюскінцы прыбылі ў Владзівасток, усхвалявала ўвесь Саюз.

Паездка чэлюскінцаў з Владзівастока ў Маскву праз усю Сібір, праз Урал з'явілася трыумфальнай урачыстай паездкай пераможцаў. Уся краіна ад малога да вялікага радасна, з велізарным уздымам сустракала герояў Арктыкі. Днём і ўначы, пры святле сонца і пры агнях факелаў, на вялікіх станцыях і малых паўстанках экспрэс з чэлюскінцамі чакалі дзесяткі тысяч людзей. З радасцю віталі яны герояў, кветкамі ўсыпалі ім шлях.

Усё, чым багаты вялікія абшары Совецкага Саюза ад Владзівастока да Масквы, усё, чым могуць ганарыцца рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгаснікі,—усё дарылі дарагім госцям.

Эскадрыллі самалётаў суправаджалі спецыяльны экспрэс. Ганаровыя варты ваенных часцей рапартавалі чэлюскінцам.

Сустрэча ў Маскве ператварылася ва ўсенароднае свята. Ніколі не забудуць чэлюскінцы таго ўсеагульнага ліхавання, тэй усеагульнай радасці, тых бурных захапленняў, якія панавалі ў дзень 19-га чэрвеня на вуліцах залітай сонцам і кветкамі Масквы.

Вялікая радзіма з велізарнай любоўю сустракала сваіх лепшых, дастойных сыноў—чэлюскінцаў і лётчыкаў, пераможных суровую стыхію Арктыкі.

Тав. ШМІДТ—начальнік чэлюскінскай экспедыцыі.

Вялікі капітан краіны Советаў, вялікі палкаводзец пролетарскай рэволюцыі т. СТАЛІН і яго лепшыя саратнікі, штаб ленінскай партыі, прышлі на Красную плошчу вітаць мужных чэлюскінцаў, іх адважных кіраўнікоў і герояў-лётчыкаў. Часці Чырвонай арміі, сотні танкаў урачыстым маршам прайшлі перад трыбунай гістарычнага маўзалея, аддаючы воінскую пашану героям лёдавага пахода. Незлічоныя залоны дэманстрантаў громам прывітанняў салютавалі дарагім гасцям.

Што натхніла, прымусіла 160 млн. сэрцаў радасна біцца пры вестцы аб выратаванні і прыездзе чэлюскінцаў? Што аб'яднала ў адным парыве мільёны людзей? Чаму ўся краіна паўстала на дапамогу чэлюскінцам?

Таму, што чэлюскінцы на блукаючай ільдзіне ў далёкім палярным моры, якое кожную мінуту пагражала праглынуць іх, паказалі сябе смелымі, вернымі, самаадданымі сынамі вялікай радзімы. У самых цяжкіх умовах, якія толькі можна сабе ўявіць, яны не страцілі бадзёрасці, упэўненасці ў сваіх сілах, веры ў моц сваёй краіны. Яны паказалі сапраўдную мужнасць людзей, выхаваных комуністычнай партыяй.

Лагер Шмідта жыў адным жыццём з усім Совецкім Саюзам. Гэта не быў спакой людзей, страціўшых усякія надзеі, гэта не быў гераізм адчаю. Гэта быў спакой большавіцкага, мужнага калектыва, вытрыманых людзей, прайшоўшых школу Сталіна, школу пролетарскай рэволюцыі.

Не пошукі прыгод, не рэкардсменства штурхнула чэлюскінцаў ў далёкую Арктыку. Яны выконвалі адказнае навуковае заданне, яны выконвалі баявую дырэктыву партыі і выканалі яе з гонарам і славай.

У чэлюскінскай эпапеі, як у люстры, адбілася велізарная моц і веліч нашай соцыялістычнай радзімы. Выратаванне чэлюскінцаў—гэта гістарычная перамога совецкай тэхнікі—самалётаў, параходаў, радыё,—перамога большавіцкай волі, рашучасці і гераізма.

Чэлюскінская эпапея з'явілася велізарнай праверкай совецкіх людзей, совецкай тэхнікі. Гэта праверка паказала, што мы можам у любых, самых цяжкіх умовах разлічваць на свае ўласныя сілы, на сваю вырасшую тэхніку, на нашых лётчыкаў і маракоў. Яна паказала, што ў любы момант, па першаму закліку партыі сотні герояў паўстануць на абарону сваёй вялікай радзімы.

Пройдуць гады. Але ў памяці мільёнаў людзей назаўсёды захаваюцца вялікія дні чэлюскінскай эпапеі, дні, калі да закінутага ў далёкім моры лагера Шмідта былі прыкаваны зрокі ўсяго света.

Ганарыся краіна, нарадзіўшая такіх герояў!

С. БУТОМАЎ

Работніца і Калгасніца
БЕЛАРУСІ

Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЧЭРВЕНЬ 1934 г.

Выходзіць два разы ў месяц

№ 12

14 ГОД

(Да 14 гадавіны вызвалення Беларусі ад бел.-палякаў)

14 год назад—11 ліпеня 1920 года—гераічная Чырвоная армія вызваліла Менск, а за ім і ўсю Совецкую Беларусь ад белапольскіх акупантаў.

Хто забудзе тыя часы, калі акупанты ператваралі нашы гарады і вёскі, нашы фабрыкі і заводы ў руіны, калі наша краіна пакрывалася лесам шыбеніц.

Совецкая Беларусь першай прыняла на сябе ўдары імперыялістычных захватчыкаў — ад войск германскага імперыялізма да белапольскіх акупантаў.

Следам за легіонамі генерала Доўбар-Мусніцкага, агнём і мячом руйнаваўшымі многія гарады і вёскі нашай краіны, прышлі войскі германскага імперыялізма. Але разбіўшы ланцугі нямецкай акупацыі, наша краіна зноў аказалася захвачанай войскамі польскай буржуазіі.

Верныя лакеі інтэрвентаў—контр-рэволюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты — усе гэтыя Ластоўскія, Лёсікі, Луцкевічы і да іх падобная зграя іншых прыслужнікаў контр-рэволюцыі—прадавалі нашу краіну гуртом і ўраздроб.

Яны пісалі слёзныя пасланні і кайзеру Вільгельму, і ў Лондан англійскім імперыялістам, і ў Парыж, і ў Вену, і ў Варшаву, і белагвардзейскім генералам, просячы больш штыхоў і гармат, каб затапіць у крыві рэволюцыйны рух у нашай краіне, каб задушыць ненавісных ім большэвікоў, каб аднавіць у нашай краіне ўладу памешчыкаў і капіталістаў.

Акупантаў, разбураўшых нашу краіну, акупантаў, чый кожны крок адзначаўся пажарамі, разбурэннямі, расстрэламі і катаваннямі, беларускія контр-рэволюцыйныя нацдэмы з лакейскай стараннасцю называлі „збавіцелямі зямлі беларускай".

Беларускія нацыянал-дэмакраты служылі каму хочаце—будзь гэта англійскі імперыяліст, або кайзер Вільгельм, або белапольскі акупант, будзь гэта чорнасоценны белагвардзейскі генерал—толькі-б сесці на плечы рабочым і сялянам нашай краіны, толькі-б зрабіць працоўных Совецкай Беларусі нявольнікамі памешчыкаў і капіталістаў, толькі-б задушыць справу пролетарскай рэволюцыі.

Імперыялістычныя акупанты і іх агенты—контр-рэволюцыйныя беларускія нацдэмы—жорстка пралічыліся ў сваіх крывавых планах.

Рабочыя і сяляне нашай краіны, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пры штодзённай брацкай самаадданай дапамозе пролетарыяў усяго Совецкага Саюза, разбілі кайданы акупацыі. Наша слаўная Чырвоная армія, горача падтрыманая гераічнымі партызанскімі атрадамі, нанесла сакрушальны ўдар імперыялістычным захватчыкам.

Хто не памятае, якая спадчына нам засталася ад акупантаў? Амаль разбураная прамысловасць, зруйнаваныя гарады і спаленыя вёскі, незлічаныя

Фото Я. М. Салавейчыка



Гігацкі рост соцыялістычнага будаўніцтва БССР у 1934 г. На здымку — новы пабудаваны дом ураду з памятнікам Леніна.

Фото з Менскага музея рэволюцыі.



Так было ў час белапольскай акупацыі.
Зруйнаваны белапалякамі вакзал станцыі Койданава ў 1920 г.

цяжкія ахвяры — краіна, эканамічна знясіленая, краіна, залітая крывёю.

А што ёсць цяпер, цяпер пасля чатырнаццаці год мірнага соцыялістычнага будаўніцтва, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе правадыра т. Сталіна, пад сцягам пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Які гіганцкі скачок наперад зрабіла наша краіна разам з усім вялікім Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Пролетарыят СССР аказаў нам брацкую дапамогу не толькі ва ўзброенай барацьбе супроць імперыялістычных захватчыкаў, супроць антысовецкіх інтэрвентаў.

Пролетарыі ўсяго Совецкага Саюза акружылі нас брацкімі клопатамі, брацкай штодзённай дапамогай у справе мірнага соцыялістычнага будаўніцтва, у справе матэрыяльнага і культурнага ўздыму нашай краіны. І ў гэтым—яркі сімвал ленінскага пролетарскага інтэрнацыяналізма, брацкага яднання працоўных усіх нацыянальнасцей у нашым вялікім Саюзе Совецкіх Рэспублік.

Дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы, дзякуючы дапамозе пролетарыята ўсяго Совецкага Саюза, тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва ў Совецкай Беларусі былі больш высокімі, чым па СССР у цэлым.

6 ліпеня пролетарыі і калгаснікі, працоўныя ўсяго Саюза Совецкіх Соцыялістычных рэспублік святкавалі дзень канстытуцыі. Гэта свята ярка прадэманстравала трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі, брацкае яднанне ўсіх народаў нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, дасягнула велізарнейшых поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, сведкамі якіх з'яўляецца кожны з нас. За гады першай пяцігодкі пабудаваны дзесяткі гігантаў соцыялістычнай індустрыі. Там, дзе раней былі адвечныя і непраходныя балоты—сярод лясоў Аршаншчыны — Палесся — цяпер гудуць турбіны асінаўскай электрастанцыі, дымяцца коміны Касцюковіцкага шклогіганта, красуюць высокімі і буйнымі хлябамі прасторы мар'інскага масіва.

На месцы разбураных акупантамі кварталаў і вуліц, на месцы ранейшых драўляных хатак, на месцы, дзе яшчэ так нядаўна было пустое поле, цяпер высяцца светлашэрыя карпусы гіганцкіх камбінатаў навукі — універсітэцкага і клінічнага гарадкоў, дома ўрада, новыя клубы і школы, новыя шматпавярховыя дамы для рабочых, новыя культурна-бытавыя ўстановы.

Калгасы Совецкай Беларусі па-большэвіцку правялі веснавую сяўбу і гэтым самым зрабілі новы рашучы крок наперад па шляху да калгаснай заможнасці.

Нацыянальная палітыка Леніна — Сталіна, за ажыццяўленне якой КП(б)Б вядзе няўхільную барацьбу, забяспечыла магутны росквіт беларускай культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу, рост мастацтва, навукі.

Ва ўсіх кутках нашай краіны, як і ўсяго СССР— ад палёў Совецкай Беларусі да далёкага Прымор'я, ад Архангельска да Каўказскіх хрыбтоў— ідзе гарачая напружаная будоўля, кіпіць творчая праца.

Пад кіраўніцтвам нашай любімай, роднай большэвіцкай партыі, пад кіраўніцтвам нашага любімага і мудрага Сталіна мы будуем бясклясавае соцыялістычнае грамадства, цвёрда і ўпэўнена ідучы ўсё наперад і наперад.

Але класавы вораг яшчэ недабіты. Рэшткі класава-варожага ахвосця, кулацкія недабіткі з усіх сваіх апошніх сіл імкнуцца нам нашкодзіць, затармазіць наш пераможны рух наперад.

Нам трэба ў сваёй штодзённай рабоце яшчэ вышэй і вышэй узнімаць нашу класавую рэвалюцыйную пільнасць; каб своечасова і ў корані прасякаць малейшыя вылазкі класавага ворага, манеўры недабітага кулацкага ахвосця.

Шчыльней-жа згуртуем свае рады вакол ЦК нашай ленінскай партыі і тав. Сталіна, вакол ЦК КП(б)Б.

Будзем-жа з яшчэ большай энергіяй, яшчэ з большым уздымам змагацца за выкананне гістарычных рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б.

Наперад, да новых перамог!

Памяці тав. Клары Цэткін

20 чэрвеня споўнілася гадавіна смерці вялікага рэволюцыйнага барацьбіта, выдатнейшага правадыра сусветнага комуністычнага руху тав. Клары Цэткін.

Жыццё Клары Цэткін з ранняй моладасці было аддана на службу рэволюцыйна-вызваленчай барацьбе рабочага класа. Звыш 50 год яе жыцця былі напоўнены нязломнай рэволюцыйнай дзейнасцю, якая непарыўна звязвае ўсё яе жыццё з гісторыяй германскага і міжнароднага рабочага руху.

Тав. Клара Цэткін паспяхова вяла вялікую і адказную работу таксама і ў галіне міжнароднага жаночага руху. Яна была арганізатарам і кіраўніком жаночых канферэнцый, якія збіраліся праз кожныя два гады ў Германіі пры ўдзеле прадстаўніц усіх краін, на пярэдадні з'езда соцыял-дэмакратычнай партыі.

Летам 1910 года ў Капенгагене адбылася другая міжнародная соцыялістычная жаночая канферэнцыя, якая па ініцыятыве Клары Цэткін рашыла абвясціць дзень 8-га сакавіка міжнародным жаночым днём.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

29-га чэрвеня—1 ліпеня 1934 года адбыўся чарговы пленум Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). Пленум разгледзеў наступныя пытанні:

1. Аб выкананні плана паставак зярна і мяса.
2. Аб палепшанні развіцця жывёлагадоўлі.

ЧЭРВЕНЬСКІ ПЛЕНУМ ЦК ВКП(б) АБ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

З усёй вострасцю пастаўлены ў рэзалюцыі пленума ўсе пытанні развіцця жывёлагадоўлі.

Да гэтага часу жывёлагадоўля значна адставала. Гэта—найбольш адстаючы ўчастак нашай сельскай гаспадаркі. Паспяховае вырашэнне зернавой праблемы і агульнае ўмацаванне соўгасаў і калгасаў ствараюць цяпер усе ўмовы для хуткага ўздыму соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Ужо поспехі мінулага года спрыяльна ўплывалі на жывёлагадоўлю і асабліва на жывёлагадоўчыя соўгасы.

Размеры прыплоду і, што асабліва важна, яго захаванасць сёлетняй вясной значна вышэй, чым ва ўсе папярэднія гады. Гэта значыць, што ў бягучым годзе мы можам дабіцца пералому ў развіцці жывёлагадоўлі. Пара па-сапраўднаму, як уласціва большэвікам, узяцца за гэту важнейшую справу. На XVII з'ездзе партыі таварыш Сталін паставіў гэту задачу. Цяпер пленум ЦК дае разгорнутую праграму барацьбы за паспяховае развіццё соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Асноўнымі недахопамі ў гэтай галіне былі саматужніцтва, разнабой. На жывёлагадоўчых фермах больш чым дзе захаваліся дзедаўскія метады работы. Невыпадкова яшчэ да гэтага часу не ўстанавіліся найбольш эфектыўныя формы арганізацыі працы. Што ні ферма, то другая арганізацыя працы. Кіраўнікі калгасаў, МТС і раёнаў, як правіла, не займаліся дэтальна пытаннямі жывёлагадоўлі і, ва ўсякім выпадку, займаліся гэтымі пытаннямі непараўнальна менш, чым іншымі галінамі гаспадаркі.

Пара пакончыць з саматужніцтвам і ўзяцца за жывёлагадоўлю з такой энергіяй і такімі метадамі, якіх дастойна соцыялістычная гаспадарка. Так паставіў пытанне пленум ЦК.

„Для забеспячэння хутчэйшага ўздыму жывёлагадоўлі пленум ЦК ВКП(б) лічыць неабходным прымяніць, па прыкладу дзяржаўнага пасеўнага плана, метад дзяржаўнага плана развіцця жывёлагадоўлі з устанаўленнем планавых заданняў па росту пагалоўя жывёлы ў соўгасах і таварных калгасных фермах, плана вырошчвання маладняка соўгасамі, калгасамі, калгаснікамі і аднаасобнікамі і плана вытворчасці кармоў, з давядзеннем гэтых планаў да соўгасаў, калгасаў і сельсоветаў".

Соцыялістычная жывёлагадоўля павінна быць не толькі планавай, але высока прадукцыйнай, яна павінна будавацца з улікам апошніх дасягненняў навукі і тэхнікі. У пастанове пленума аддаецца таму асаблівая ўвага племянной справе і паляпшэнню пароды жывёлы, таксама як і паляпшэнню ветэрынарнай і зоатэхнічнай справы.

У пастанове прадугледжваюцца самыя розна-стайныя ільготы калгасам, усяляк стымулюючыя развіццё жывёлагадоўлі. Дастаткова сказаць, што ў 1935 годзе будзе аслабанёна ад усякіх паставак пяць мільёнаў гектараў пасеваў, з тым, каб ураджай з іх цалкам пайшоў на стварэнне кармавой базы жывёлаводчых і коневодчых таварных ферм калгасаў. І ўжо ў гэтым годзе для тых-жа мэт будзе вызвалена ад паставак два мільёна гектараў.

Асноўным звяном ва ўздыме жывёлагадоўлі з'яўляецца разгортванне калгасных таварных ферм і ўмацаванне жывёлагадоўчых соўгасаў. Але аднавасова трэба аддаць увагу росту і паляпшэнню пагалоўя жывёлы, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстанні калгаснікаў. Аднаасобная гаспадарка калгасніка—невялікі ўчастак прысядзібнай зямлі для агарода, карова, свіння—з'яўляецца яго падсобнай гаспадаркай. Асноўнае—у калгасе. Калгаснікі вельмі зацікаўлены ў тым, каб расла і квітнела жывёлагадоўля калгаса. Сюды павінен быць накіраван галоўны іх інтарэс.

За другую палову мінулага года 900 тыс. калгаснікаў надзелены цялятамі. У гэтым годзе калгаснікам будзе прадана яшчэ 2 мільёны цёлак, для чаго дзяржава адпускае бяспроцантны крэдыт у 70 мільёнаў рублёў. Апрача таго ім будзе выдзелена 2.700 тыс. парасят і 700 тыс. ягнят. Толькі совецкая дзяржава можа намеціць і выканаць такія грандыёзныя планы, толькі яна можа сабе дазволіць такія затраты для дапамогі мільёнам сялян.

Задачы пастаўлены дакладна і ясна. Цяпер, закасаўшы рукавы, за справу! І таксама, як і ў зернавой галіне, першай запаведдзю з'яўляецца тут выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай. План мясапаставак у радзе раёнаў выконваецца нездавальняючы. Гэта—прамы рэзультат няўважлівасці партыйных арганізацый гэтых раёнаў да жывёлагадоўлі. Не можа і не павінна быць працістаўлення мясазагатовак развіццю жывёлагадоўлі. Адно павінна быць цесна звязана з другім. Мясапастаўкі павінны быць выкананы кожнай гаспадаркай без усякага выключэння.

Мы ўзяліся за ўздым жывёлагадоўлі ў значна больш спрыяльных умовах, чым тыя, пры якіх вырашалася зернавая праблема. Гэта ясна ўсякаму. Труднасцей не трэба пераўмяншаць, але яны будуць пераможаны яшчэ хутчэй. Мы падымем соцыялістычную жывёлагадоўлю на небывалую вышыню.

(З перадавой „Правды").

... Галоўнае ў арганізацыйнай рабоце—падбор людзей і праверка выканання (СТАЛІН).

З невялічкага працколектыва да буйнай, механізаванай фабрыкі

Цукеркавая фабрыка „Комунарка"—дзецішча першай пяцігодкі—пабудаваная ў 1931 годзе з ліку „518". Чыстыя і светлыя цэхі, упрыгожаны зеляніню. На фабрыцы працуе 1100 рабочых, з якіх больш 60 проц. работніц. Штодзённы выпуск прадукцыі—45 тон.

Некалькі слоў аб гісторыі фабрыкі. У 1922 годзе арганізаваўся працкалектыў „Прагрэс". Там было 10—15 чалавек рабочых. Цукерак выпускалася 20—30 *кг* у дзень, — такая колькасць выпускаецца цяпер адной брыгадай за 10—15 мінут.

Фабрыка „Комунарка" мае цяпер вялікія дасягненні ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў і ў паляпшэнні культурна-бытавых умоў работніц. Ёсць яслі, дзіцячы сад, чырвоныя куткі ў кожным цэху. Выходзіць друкаваная шматтыражка, 20 насценных газет. Пры фабрыцы ёсць сад, радыёвузел, бібліятэка, інтэрнат.

Расце фабрыка, растуць і людзі. Работніца Мерсон прышла ў 1922 годзе ў працкалектыў. Працавала прыбіральшчыцай. Калі арганізавалася фабрыка Мерсон пачала авалодваць тэхнікай вытворчасці. Цяпер яна брыгадзір лінейных сталоў карамельнага цэха, адна з лепшых брыгадзіраў фабрыкі, якім ганарыцца ўвесь рабочы калектыў. Імя тав. Мерсон неаднаразова сустракалася ў цэнтральным і фабрычным друку. Тав. Мерсон—лепшая выдатніца па тэхнічнай і санітарнай вучобе. Яе брыгада давяла брак да $^1/_2$ проц. (па плану дапускаецца $1^1/_2$ проц.).

Брыгада дабілася гэтых поспехаў дзякуючы добрай арганізацыі работы, разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Большасць работніц брыгады здалі тэхэкзамен на „выдатна", санітарны—на „добра". За прыкладную работу тав. Мерсон прэміравана паездкай на Беламорскі канал.

Фабрыка нядаўна мела вялікія прарывы ў выкананні вытворчых заданняў. Якасць прадукцыі была дрэннай. Зварот ЦК ВКП(б) аб барацьбе за санітарыю на прадпрыемствах харчовай прамысловасці тут ігнараваўся. У цэхах было брудна. Гэтыя агідныя з'явішчы былі вынікам дрэннага кіраўніцтва трыкутніка. Гарком партыі зрабіў з гэтага адпаведныя вынікі і змяніў кіраўніцтва.

Вялікая работа праробліна па ажыццяўленню пастановы ЦК аб санітарыі. Арганізавана санітарная вучоба. У цэхах цяпер чыста. Тыя работніцы, якія раней не мылі рук перад работай, не трымалі сябе ў чыстаце, зараз зусім змяніліся.

На фабрыцы ёсць 40 работніц, якія здалі тэхнічны экзамен на „выдатна". Былыя прыбіральшчыцы сталі брыгадзірамі, пачалі авалодваць тэхнікай. Вось, напрыклад, брыгада Алейчык з лепшага чырвонасцяжнага дражэйнага цэха. Большасць работніц брыгады прышлі з вёскі, упершыню працуюць на соцыялістычнай фабрыцы. Цяпер усе работніцы брыгады авалодалі тэхнікай машын. Брыгада прэміравана камітэтам па ўсебеларускаму агляду, брыгадзір Алейчык прэміравана патэфонам.

Работніца Камісарава паступіла на фабрыку ўборшчыцай. Цяпер яе брыгада самая лепшая ў карамельным цэху.

На фабрыцы разгорнута масавая работа. Вельмі многа даюць штодзённыя дзесяцігвілінныя творчыя нарады, зменна-сустрэчнае планаванне. Разгорнута індывідуальнае соцспаборніцтва ў брыгадах. Усё гэта забяспечыла фабрыцы выкананне плана за першае паўгоддзе на 25 чэрвеня на 103 проц. у натуральным выражэнні, а ў цэннасным — на 101 проц. Бісквітны цэх выканаў план на 123 проц., мягка-шакаладны — на 103, карамельны — на 102, дражэйны—на 101.

Фабрыка пачынае займаць адно з першых месц у конкурсе па агляду харчовых прадпрыемстваў.

Безумоўна, на фабрыцы ёсць яшчэ рад недахопаў. Не ўсё яшчэ зроблена ў сэнсе пастаноўкі ўзорнай партыйна-масавай работы на фабрыцы.

Перад нашым калектывам цяпер стаяць баявыя задачы—завяваць першае месца ў конкурсе харчовых прадпрыемстваў.

Фрыд.

Менск.

Зверху ўніз—брыгада Алейчык з дражэйн. цэха, якая прэміравана камітэтам па агляду харчовых прадпрыемстваў. Корпус фабрыкі. У авале—лінейная машына карамельнага цэха (цэх азелянён).

Жыццё працоўнай сялянкі ў Заходняй Беларусі

Нядаўна ў Менску закрыўся ўсебеларускі злёт ударніц—калгасніц і работніц соўгасаў. На гэтым злёце ўдарніцы соцыялістычных палёў падводзілі вынікі сваёй работы, расказвалі аб сваіх дасягненнях. Злёт ярка паказаў рост палітычнай актыўнасці нашай калгасніцы, калісьці адсталай, забітай сялянкі. Гэтыя дасягненні мы маем дзякуючы кіраўніцтву партыі, дзякуючы тым клопатам, якімі абкружае партыя і совецкая ўлада жанчыну—ударніцу.

Зусім у іншых умовах жыве сялянка ў Заходняй Беларусі. Эканамічны крызіс, які прадаўжаецца ўжо некалькі год у капіталістычных краінах, яшчэ больш пагоршыў становішча працоўных сялян Заходняй Беларусі. Сяляне галадаюць, з іх бязлітасна выціскаюцца непасільныя падаткі. Нават буржуазныя газеты не ў сілах утаіць тое жудаснае становішча, у якім знаходзіцца працоўнае сялянства Заходняй Беларусі.

Віленская фашысцкая газета „Слова“ (орган абшарнікаў) ад 12 мая 1934 года піша: „У вёску Каларовічы прыбыў секвестратар Казімір Бартынскі. Сяляне, убачыўшы секвестратара, разбегліся і выгналі жывёлу, жадаючы перашкодзіць секвестратару. Але Бартынскі прыступіў да сваёй справы, калі сялян не было. Калі секвестратар гнаў жывёлу ў маёнтак Бізеравічы, па дарозе яго сустрэла ехаўшая конна сялянка Кацярына Барышэўская. Секвестратар прыстаў да яе, каб яна за нядоімкі па падатках аддала свайго каня. Барышэўская супраціўлялася. Секвестратар моцным ударам кулака збіў Барышэўскую на зямлю і ўзяў каня“.

Селяніна, які адважыцца не аддаць почасці пану, як гэта яму падабаецца — штрафуюць, збіваюць, варварскі з яго здзекваюцца. Вось аб чым піша нават соцыял-фашысцкі „Работнік“ ад 16-га мая:

„Войт (валасны старшыня) Ястрэбінскай гміны аштрафаваў за „няўмелую“ размову з панам войтам сялянку вёскі Малахаўцы, Баранавіцкага павета, Еву Ярмолік на два злотых. Баранавіцкі павятовы староста павялічыў штраф да чатырох злотых, а секвестратар прышоў з патрабаваннем заплаціць 7 злотых. У сялянкі не было грошай, яна пачала прасіць, каб пачакалі некаторы час і тады яна сама ўнясе грошы ў волась, але секвестратар не хацеў аб гэтым нават слухаць і стаў забіраць у яе апошні кажух. Жанчына стала супраціўляцца. Секвестратар зараз-жа звярнуўся да каменданта пастарунка. Хутка прыбыў і сам камендант. Што рабілася ў хаце—нам невядома, толькі былі чуваць крыкі: „ратуйце, забіваюць“. Пры збіванні жанчыны секвестратар і камендант парвалі на ёй усю вопратку, і забралі апошнюю пару чаравік. Даведзеная пабоямі да адчаю, у парванай кашулі, амаль голая жанчына з крыкам пачала бегаць па вёсцы. Праз некаторы час дом Ярмолік быў ахоплен полымем, пажар ахапіў усю вуліцу і згарэла 18 дамоў. Ярмолік кінулася ў раку, але ўдалося яе выратаваць. Зараз яна знаходзіцца ў бальніцы“.

Буржуазная яўрэйская газета „Вільнер тог“ таксама не можа ўтаіць жабрачага, галоднага жыцця жанчыны сялянкі ў Віленшчыне. Вось характэрны прыклад. Не гледзячы на тое, што ў Латвіі ёсць шмат беспрацоўных (толькі ў Рызе налічваецца 20.000 беспрацоўных мужчын), латвійскі ўрад усё-ж зварачваецца за рабочай сілай у Заходнюю Беларусь, бо яна тут вельмі танная. І калі ў Свінцянах была вывешана аб'ява аб наборы 2.000 жанчын на сельскагаспадарчыя работы ў Латвію, то запісалася шмат больш кандыдатак, чым патрабавалася.

Вось як жывуць жанчыны, якія працуюць у „Нізянах“—маёнтку двух братоў, буйных абшарнікаў. На табачнай плантацыі тут работніцы зарабляюць 12 злотых у месяц. Жывуць яны ў душных казармах. Хадзіць у вёску забаронена. Калі хто прыходзіць у казарму пазней вызначанага часу, то плаціць пяць злотых штрафу. Абшарнікі б'юць работніц і гвалцяць іх. Калі работніцы хочуць пакінуць маёнтак, то ім не выплачваюць за прапрацаваны час.

Гэтыя факты ўзяты выключна з буржуазных газет, якіх мы не можам западозрыць у жаданні прадставіць у цёмным свеце капіталістычную сапраўднасць. Можна сабе ўявіць, што прадстаўляе з сябе жыццё працоўных сялянак у сапраўднасці, калі нават буржуазны друк не можа ўтаіць фактаў, якія мы падалі вышэй.

Але працоўныя сялянкі Заходняй Беларусі ўсё больш уключаюцца ў рэволюцыйную барацьбу. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Заходняй Беларусі яны становяцца ў рады змагароў супроць капіталізма, супроць фашызма. Працоўная сялянка Заходняй Беларусі ведае, што толькі пад сцягам Комінтэрна, у рашучай барацьбе з фашызмам яна заваюе свае правы, як іх заваявала жанчына ў краіне Советаў.

Каця Матулайціс.

У дзень 14 гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў—брацкае пролетарскае прывітанне сёстрам па класу—работніцам і працоўным сялянкам Польшчы і Заходняй Беларусі!

НА ЗЛЁЦЕ

Бадзёрыя калгасныя спевы напоўнілі Менскі дом Партактыва. У гэтых спевах адчуваўся свежы подых квітнеючых ільняных палёў Сенненшчыны, мора Слуцкай пшаніцы. Гэта дужасць вольнага жыцця жанчын калгаснай вёскі.

450 лепшых з лепшых ударніц з'ехаліся на злёт, каб падзяліцца вопытам барацьбы за перамогі ў веснавой сяўбе, праполачнай, у падрыхтоўцы да ўборкі, намеціць задачы на далейшы час.

Дэлегаткі ўважліва выслухалі даклад наркома земляробства тав. Бэнека і садаклад тав. Сандлер.

На трыбуне—старэйшая з калгасніц Барысаўскага раёна—Ева Дубень. Яна яшчэ добра памятае паншчыну, перанесла паўгалоднае жыццё сялянкі. Яе словы простыя, кароткія.

— Мы цяпер багацей за ўсіх на свеце. Мне хоць і 64 гады, але ўсё-ж я выпрацавала ў гэтым годзе 105 працадзён і зараз штодзень выходжу на работу. Бывае часта, што выконваю і па дзве нормы за дзень.

Дзеці часта лаюцца: на што табе, мама, кожны дзень на работу выходзіць—пасядзела-б дома лепш. Хлеба ў нас досыць, бульбы хапае. Але я дома не магу сядзець, бо бачу, што палі зарастаюць пустазелем. Ды маладыхжа трэба вучыць, як палоць.

Пашла, гэта, я на праполку першы раз. Бачу, па 10 чалавек працуюць разам на адным кавалку. То адна абгоніць і другіх чакае, то ўсе чакаюць адну палольшчыцу, а ўвечары ў праўленне скардзяцца, што нормы вельмі вялікія і выканаць нельга. Я ўзялася за гэтую справу. Брыгадзір мне выдзеліў асобны загончык і я стала працаваць. На спаборніцтва выклікала Крышталь Ксеню і Клімковіч Варку. У час абедзенага перапынку падвялі вынікі нашага спаборніцтва. Аказалася, што я да абеда выканала сваю норму і якасць у мяне лепшая, а яны нават і паўнормы не выканалі. Увечары абмеркавалі гэта пытанне і пастанавілі больш кучай не працаваць. Кожнай выдзелілі асобны ўчастак, і тыя, што скардзіліся раней на вялікія нормы, пачалі іх перавыконваць.

У мінулым годзе на працадзень мы атрымалі па 4 *кгр* збожжа і па 8 *кгр* бульбы. Думаю, што ў гэтым годзе, калі мы дагледзім добра пасевы, то атрымаем яшчэ больш. Зараз мы ўжо гатовы да ўборачнай і абавязваемся яе правесці па-баявому.

Фота МАЗЕЛЕВА

Зверху ўніз—дэлегаткі злёту—**Колатава, Міхневіч, Прыбытко.**

Я кажу проста, што мы гэтых поспехаў дасягнулі толькі дзякуючы кіраўніцтву нашага палітаддзела, які нас вучыць працаваць. Пры дапамозе палітаддзела мы высоўваем лепшых ударніц на кіруючую работу.

Колатава Ганна з калгаса „Пражэктар", Цараўскага сельсовета, Слуцкага раёна, расказала аб барацьбе за сяўбу.

— У мяне пяцера дзяцей. Я ўдава, але, не гледзячы на гэта, за ўвесь час жыцця ў калгасе ў мяне не было ніводнага прагула. У час сяўбы я кіравала жаночым звяном аратых з чатырох чалавек. Норму ворыва заўсёды перавыконвалі. Маё звяно аратых было перадавым у другой брыгадзе. Першая-ж брыгада адставала на сяўбе. Зараз мяне перакінулі ў гэту брыгаду для ўмацавання работы на праполцы. Гэта брыгада выйшла таксама ў перадавыя. Наогул, у нас жанчыны працуюць добра. Напр., звяно баранавальшчыц Кароль Клаўдзі перавыконвала нормы па баранаванню. Жанчыны не толькі працавалі аднолькава з мужчынамі, але ішлі яшчэ і наперадзе.

Акрамя звеннявода я—інспектар якасці. Праверыўшы якасць сяўбы ў брыгадзе Караля Санькі, я ўстанавіла, што пасеяна дрэнна. Паўтары гектары аўса пасеяна ў аднавор, рэдкія ўсходы, бульба пасаджана так, што ляжыць зверху. Кароль на мяне скардзіўся і хацеў нават перадаць справу ў пракуратуру за паклёп. Мы выклікалі агранома з МТС, які ўстанавіў, што мая ацэнка была правільнай.

У час поліва ўсе 70 жанчын з нашага калгаса былі разбіты на звенні па 3-4 чалавекі. Норма выпрацоўкі заўсёды перавыконвалася. За ўдарную работу на сяўбе і праполцы мы прэміравалі лепшую нашу ўдарніцу Траян Саламею.

Але ў калгасе ёсць яшчэ гультаі. Напрыклад, Мароз Марыля гультуе, позна выходзіць на работу, нормы не выконвае, ды яшчэ і травіць лепшую ўдарніцу Траян Саламею. Адпеты гультай таксама Кароль Ганна. На работу выходзіць позна, падымае лаянку ў звеннях і гэтым зрывае работу. З гэтымі гультаямі мы вядзем рашучую барацьбу.

Зараз у нас сенакос у поўным разгары Да ўборачнай падрыхтавалі сярпы, косы, нават мяшкі гатовы, каб не затрымліваць здачу збожжа дзяржаве. Прыехаўшы са злёта, я яшчэ лепш арганізую сваіх жанчын на ўборачную з тым, каб ніводнага зярняці не пакінуць на полі.

Прыбытак Таня — памочнік брыгадзіра трэцяй брыгады, калгаса імя Розы Люксембург (Слуцкі раён), гаварыла пра сваё жыццё.

— Да рэволюцыі я мела адзін гектар зямлі і жыла на ім з чатырмя дзяцьмі. Вядома, ніколі хлеба не было, дзеці пасвілі жывёлу ў кулакоў, не бачылі свету. А цяпер справа зусім іншая. У мінулым годзе атрымалі на працадзень па 3 кгр. збожжа, 8 кгр. бульбы. Для маёй сям'і аж занадта хапіла, яшчэ прадала 25 пудоў бульбы і два пуды збожжа. У гэтым годзе на працадзень мы мяркуем атрымаць у два разы больш, дзякуючы добрай своечасовай сяўбе і праполцы. На праполку хадзілі нават старухі па 75 год і праца-

валі ўдарна, як, напрыклад, Дамарат Агапа і інш. Нічыпаровіч Маня і Пятровіч Варвара— нашы лепшыя ўдарніцы на праполцы. Ёсць гультаі, якія перашкаджаюць нам у рабоце. Акуліч Жэня і Машчыцкая Надзя рэдка выходзяць на работу, а калі і выходзяць, дык працуюць вельмі дрэнна.

Шмат нам дапамагаюць у рабоце яслі. Жанчыны зусім спакойна працуюць на полі і не турбуюцца аб дзецях. Загадчыца яслі Ельніцкая Алеся працуе вельмі добрасумленна, у яе дзеці заўсёды чыстыя, накормленыя. Ужо мы падрыхтаваліся да ўборкі збожжавых. Усе чатыры жняяркі адраманаваны, сярпы назублены, падрыхтаваны косы. Прыехаўшы з Менску, я перадам сваім калгаснікам вопыт работы лепшых калгасаў, аб якім я тут чула. Буду ўжываць гэты вопыт у штодзеннай рабоце свайго калгаса, каб дасягнуць сапраўднага заможнага калгаснага жыцця.

Фото МАЗЕЛЕВА

Злева направа—дэлегаткі злёта—**Новашынская**—брыгадзір к-су „Страх ворагам", Лёзнянскага раёну, **Драздова**—брыгадзір к-су „Вольная праца" Церахоўскага раёна, **Падгалая**—нам. старш. к-су „8-ае сакавіка", Копыльскага р.

Бярговіна Марта — намеснік старшыні адказная па ільну буйнейшага к-су на Сенненшчыне— „Расна". У гэтым годзе тут пасеяна 170 *га* ільну і на 20 дзён раней, чым у мінулым годзе. Марта добра зразумела, што праполка ільну рашае ў далейшым яго ўраджай. Таму, як толькі пачало паказвацца зелле, жанчыны адразу былі разбіты на звенні, па 5 чалавек. На час праполкі і цераблення за звеннямі замацаваны пэўныя ўчасткі. Нормы ў 12 сотак на ўчастках вялікай засмечанасці і 20 сотак—на малой—лепшымі ўдарніцамі перавыконваліся.

— У нас зараз няма ўжо гультаёў—расказвае Марта.—Кожная калгасніца ведае, што лён—гэта хлеб, калі яго дбайна праполіш, дагледзіш, дык ён добра заплаціць за работу. Сёлета ў нас выросла колькасць ударніц. Вось яны лепшыя: Ціханская Ліда, Мартусевіч Алена, Какатовіч Ганна, Торган Насця, Курашэвіч Ольга Ігнатава, Ольга Яўгенава Курашэвіч, Сідаровіч Манька, Акулёнак Феня. З гэтымі людзьмі мы замацоўваем калгасную гаспадарку. У мінулым годзе лён мы здавалі 14, 12 і 10 нумарамі, а сёлета спадзяемся атрымаць яшчэ вышэйшую нумарнасць валакна. Лён мы прапалолі ўжо тры разы. І добры-ж ён сёлета, вырас высокі. Як пойдзеш на поле, зірнеш, дык ажно сэрдца радуецца.

Галенка Тэкля—лепшая ўдарніца калгаса „Дамашова", Немойцянскага сельсовета, Сенненскага раёна. Яе паслалі на злёт, за тое, што яна пабіла рэкорд норм выпрацоўкі па поліву ва ўсім раёне. У калгасе ўвесь час на праполцы працавалі кучай. Норма ў 12 сотак ніколі не выконвалася. Тэкля ўзяла сабе ўчастак і стала працаваць адна. Яна выпрацавала на вялікай засмечанасці 35 сотак *га* за дзень, а на малой засмечанасці—61 сотку за дзень. Пасля гэтага ўсе пераканаліся ў перавазе індывідуальнай здзельшчыны. Тэкля гаворыць:

— Мы лён бяражэм, як вока, бо ведаем, што гэта наша багацце,— сыравіна для соцыялістычнай прамысловасці. Асабліва берагуць яго калгасніцы—ударніцы Шыфранская Параска, Шыфранская Марыля, Кучынская Міхаліна. Паміж звеннямі заключаны соцдагавары на лепшы догляд за лёнам, выкананне якіх кожны дзень правяраецца.

— Мне ўжо 59 год,—гаворыць Міхновіч Улляна, — 19 дзяцей радзіла, але на працы маладым не ўступлю. Сёлета мы ўжо навучыліся лён апрацоўваць. У мінулым годзе было не тое. Калі лён бралі, то вязалі ў вялікія снапы, пойдзе дождж і лён прамякне ў сярэдзіне, а таму і паласа была няроўная. Цяпер ужо ўмеем сартаваць лён, вязаць, сушыць, вось чаму лён павінен быць добрым.

У нашым калгасе „Перамога" (Сенненскі раён) 92 гектары ільну, пасеялі яго на 24 дні раней, чым у мінулым годзе, выпалалі таксама лепш. Зараз ён чысты, прыгожы такі. Калгасніцы нашы, здаецца, усё жыццё аддалі-б за лён. Вось Варка Міхновіч, Панімашэнка Марыля, Міхновіч Шура, Маркавец Хрысціна, Салаўёва Аксіня, Панімашэнка Улляна. Яны, як толькі ўбачаць, бывала, што дождж надыходзіць пры ўборцы, дык адразу мабілізуюцца і ратуюць лён. Сёлета яны сачылі за пасевам, правяралі праполку кожнага гектара, каб не патапталі, не змялі.

Прыехаўшы са злёта, я раскажу сваім жанчынам, што нам трэба яшчэ пільней сачыць за ільном, каб здаць яго дзяржаве не ніжэй 14 нумара. Вось толькі-б хацела папрасіць злёт, каб пашырыць дзейнасць палітаддзела і на наш калгас, каб нам больш машын дасылалі і самі палітаддзельцы часцей прыязджалі.

* * *

Так ударніцы соцыялістычных палёў дзяліліся вопытам барацьбы ў час сяўбы і праполкі на ўсебеларускім злёце, які адбыўся 15-17 чэрвеня. Яны цвёрда запамяталі задачы, пастаўленыя злётам, абавязаліся ўсе рашэнні злёта праводзіць у жыццё.

С.

„ЦК асабліва падкрэслівае важнасць барацьбы за захаванне ўраджая ад раскрадвання, як на карню, так і пасля ўборкі і абавязвае ўсе мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі, у тым ліку палітаддзелы цвёрда ажыццяўляць закон ад 7 жніўня 1932 года „аб ахове соцыялістычнай грамадскай уласнасці".

З пастановы чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б).

ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАЛГАСЫ, ЗА

15—17 чэрвеня гэтага года адбыўся злёт лепшых ударніц калгасаў і соўгасаў Беларусі.

Злёт прайшоў пад знакам мабілізацыі шырокіх мас жанчын-калгасніц і соўгасніц на ўдарнае завяршэнне пасяўной кампаніі, на своечасовае правядзенне ўборкі без страт і большэвіцкае выкананне абавязкаў перад пролетарскай дзяржавай.

Злёт падкрэсліў неабходнасць узмацнення арганізацыйна-масавай работы сярод жанчын калгасаў і соўгасаў.

З трыбуны злёта лепшыя ўдарніцы дзяліліся вопытам сваёй работы, далі абяцанне яшчэ лепш працаваць, па-ўдарнаму правесці ўборку і своечасова выканаць усе абавязкі перад дзяржавай.

Ніжэй друкуем абавязацельствы злёта. Гэтыя абавязацельствы павінны быць прапрацаваны ў кожным калгасе і соўгасе. Адказам на гэтыя абавязацельствы будуць канкрэтныя справы—своечасовае выкананне ўсіх палявых работ і здача дзяржаве ўсіх відаў загатовак.

Самаабавязацельствы ўсебеларускага злёта ўдарніц-калгасніц і работніц соўгасаў

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Мы сабраліся на ўсебеларускі злёт ударніц-калгасніц і работніц соўгасаў пасля баявой веснавой сяўбы.

Няўхільна праводзячы ў жыццё ўказанні нашай мудрай ленінскай партыі і яе вялікага правадыра тав. Сталіна, пры штодзенным кіраўніцтве Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі,—мы дабіліся ў гэтым годзе вялікіх поспехаў. Мы скончылі сяўбу адначасова з ордэноснымі Маскоўскай вобласцю і Горкаўскім краем. Такой сяўбы Беларусь яшчэ не бачыла і багатыя ўсходы гавораць нам, як правільны і мудры прызыў нашай партыі СЕЯЦЬ РАНА І Ў СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ.

Аднак, у нас, у БССР ёсць і адстаючыя. Наш кіраўнік тав. ГІКАЛО ў сваім артыкуле дае лозунг: „Ні аднаго адстаючага раёна, сельсовета, соўгаса, калгаса, брыгады", і мы звараčаемся да калгасніц і соўгасніц Мсціслаўшчыны, Пухавіч, Горак і іншых адстаючых у сяўбе раёнаў: вы-ж цягнеце ўніз усю БССР, вазьміцеся па-баявому за калгасную справу, ачыщчайце калгасы ад кулацкага ахвосця, змагайцеся за жалезную працоўную дысцыпліну і тады вы напэўна выйдзеце ў перадавыя.

Таварышы, Совецкая Беларусь мае ўсе магчымасці, каб сабраць добры ўраджай. Сяўбу мы правялі рана, апрацавалі зямлю нядрэнна, усходы па ўсёй БССР ідуць добра. Наша задача заключаецца ў тым, каб правільна арганізаваць догляд ураджаю, своечасова правесці ўборку, захаваць сабранае і, такім чынам, замацаваць поспехі веснавой сяўбы.

ЦК КП(б)Б на чэрвеньскім пленуме гэтага года вынес пастанову аб бліжэйшых чарговых задачах практычнай работы па сельскай гаспадарцы. У гэтай пастанове пленума ЦК КП(б)Б пералічаны ўсе асноўныя практычныя задачы, выкананне якіх з'яўляецца неабходным для паспяховага правядзення ўборачнай кампаніі.

Комуністычная партыя кіруе намі ў нашай барацьбе ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва і наш абавязак заключаецца ў тым, каб, узброіўшыся пастановай ЦК КП(б)Б, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і партаддзелаў, узяцца дружна, па-баявому, па-большэвіцку за работу, убраць хутка і без страт ураджай, прыняць меры да развіцця жывёлагадоўлі і зрабіць яшчэ адзін крок па шляху стварэння большэвіцкіх калгасаў і заможных калгаснікаў. Гэта цалкам залежыць ад нас самих. Толькі ў тым выпадку, калі ўсе калгаснікі і калгасніцы, усе рабочыя і работніцы соўгасаў, усё працоўнае бадняцка-серадняцкае сялянства возьмуцца дружна за работу, мы правядзем уборачную кампанію так, як аб гэтым указвае наша партыя: хутка і без страт.

Мы, ударніцы-калгасніцы і работніцы соўгасаў, сабраўшыся на ўсебеларускі злёт і абгаварыўшы ўсе гэтыя пытанні, прызнаем, што ўсе магчымасці ў БССР для ажыццяўлення гэтых задач ёсць. На падставе гэтага з поўным усведамленнем сваёй адказнасці за далейшую работу ў калгасах і соўгасах, мы прымаем ад імя ўсіх калгаснікаў і калгасніц, рабочых і работніц соўгасаў абавязацельствы аб нашай далейшай рабоце.

Мы абавязваемся самі і заклікаем усіх калгасніц і работніц соўгасаў да барацьбы за наступнае:

1. Па праполцы зернавых, тэхнічных і гародніх культур

Правесці праполку ад пустазелля ўсіх зернавых пасеваў, яравых зернавых культур, усе пасевы ільну праполаць не менш 2-х раз, а па селекцыйнаму ільну—3-х разоў, па шырокарадных пасевах правесці не менш двух міжрадных апрацовак. Па бульбе правесці не менш 2—3 прапашак з наступнай запраўкай бульбяніка і праполкай у радах. Па гародніх культурах і каранплодах правесці не менш 2-3 раз праполку.

Гэтыя абавязацельствы маюць велізарнае значэнне ў нашай барацьбе за высокі ўраджай. Як нам ні сорамна, але мы ўсе павінны прызнаць, што, едучы на ўсебеларускі злет у Менск, мы ў сваіх і суседніх раёнах бачылі, што амаль усюды яшчэ пануе жоўтая свірэпка. Мы абавязаны абвясціць бязлітасную барацьбу супроць свірэпкі, якая з'яўляецца вынікам нашай нядбайнасці, нашай дрэннай работы, нашага дрэннзга догляду палёў. Знішчыць свірэпку, знішчыць гірсу, знішчыць усё пустазелле з коранем шляхам лушчэння палёў пасля ўборкі зернавых—вось наш заклік да ўсіх калгасніц, калгаснікаў, рабочых і работніц соўгасаў.

2. Па сенаўборцы

У мінулыя гады мы дрэнна праводзілі сенаўборку. З прычыны гэтага мы адчувалі вялікі недахват сена, сіласу для нашай жывёлы. Мы абавязаны прыняць усе крокі для таго, каб загадзя падрыхтавацца да зімы, каб забяспечыць нашу жывёлу неабходнымі кармамі. Для гэтага нашым важнейшым абавязацельствам з'яўляецца—пачаць своечасова і скончыць з поспехам сенаўборку. Мы звычайна зацягваем сенакос. Сенакос у нас урэзваецца ва ўборку зернавых, з прычыны чаго мы трацім і на сене, бо не паспяваем зрабіць другога ўкоса, трацім і на ўборцы зернавых.

Таму наша прапанова—гэта біцца за тое, каб касьбу і сенаўборку скончыць у бліжэйшыя дні, не пазней, як да пачатку ўборкі зернавых. Мы абавязаны сенаўборку праводзіць у раннія і больш кароткія тэрміны. Мы абавязаны правесці два ўкосы сеяных шматгадовых траў і натуральных сенажацей. Мы абавязаны так арганізаваць працу на сенакосе, каб следам за касьбой травы ішло падварушванне сена, яго прасушка з тым, каб стагаванне сена адбывалася не пазней 3—5 дзён пасля касьбы. Мы абавязваем камісіі па якасці правяраць становішча сенакосаў, наглядаць за чыстатой касьбы, за зграбаннем, правільным стагаваннем, не дапушчаючы страты сена як пры сенаўборцы, так і пры перавозцы сена ў сенахавальні і т. д. Каб з поспехам

Зверху ўніз—у прэзідыу
гутарыць з дэлегаткамі.
Оршанскага і Баб

вырашыць гэту задачу, мы абавязаны поўнасцю скарыстаць наяўныя ў МТС, соўгасах і калгасах сенаўборачныя машыны (сенакасілкі, граблі).

Жанчына-калгасніца ў гэтым годзе пакажа, што і ў касьбе яна не адстае ад свайго таварыша калгасніка. Рады ўдарніц-калгасніц павялічацца ў час сенакашэння, бо жанчына-калгасніца абавязана прыняць і прымае ўдзел у паспяховым правядзенні касьбы.

3. Па ўборцы зернавых

Пленум ЦК КП(б)Б пастанавіў лічыць, што „лозунгам кожнага соўгаса і калгаса, кожнага калгасніка і аднаасобніка павінна быць—**ніводнага зярна страты**".

Таварышы калгасніцы і работніцы соўгасаў! Мінулы год нам паказаў, як шмат нашай працы дарэмна прападае на палях з прычыны таго, што мы дрэнна арганізуем уборку зернавых.

Мы абавязаны праводзіць уборку зернавых у пачатку васковай спеласці.

Мы абавязаны сачыць за сваім полем і прыступаць да ўборкі зернавых па меры выспявання асобных яго ўчасткаў.

Мы абавязаны так арганізаввць уборку, каб не даваць хлебу перастойваць і абсыпацца на полі.

Мы правядзем уборку зернавых хутка і без страт, калі ў нас у калгасах будуць добра працаваць машыны. Наш абавязак ударніц-калгасніц заключаецца ў тым, каб акружыць увагай і замілаваннем уборачныя машыны. Машына—наш дапаможнік, які вызваляе нас ад самай цяжкай, самай напружанай працы. Калі якая-небудзь машына дрэнна працуе, то выключна па нашай віне. Мы яе дрэнна даглядаем. Мы яе дрэнна ведаем, а кулацкае ахвосце ўсялякімі спосабамі агітуе супроць машыны.

Наш прызыў да ўсіх калгасніц, соўгасніц-ударніц—**вывучаць машыну**. Наша месца—на курсах машынаводаў, наша месца—на жняярцы, на касілцы, ля руля трактара і ільнацерабілкі, ля машыны „Гільштэйн", ля малатарань. Няхай таварышы калгасніцы і соўгасніцы-ўдарніцы навучацца кіраваць машынай, паказваючы прыклады свядомых адносін да машыны, змагаючыся за тое, каб машына не зношвалася датэрмінова, а працавала доўга. Ні адна жняярка, ні адна лабагрэйка не павінны мець ні аднаго дня прастою.

Разам з гэтым мы прызнаем, што трэба больш шырока прымяняць пры ўборцы зернавых і касу. Калі не даць ураджаю перастаяць, то каса не дасць ніякай страты, а КОЖНАЯ КАСА МОЖА ЗАМЯНІЦЬ 5 СЯРПОЎ. У нашых-жа беларускіх умовах, дзе дорага кожная гадзіна, каса можа захаваць шмат ураджаю. Серп яшчэ і ў гэтым годзе трэба адтачыць своечасова і там, дзе прыдзецца працаваць і сярпом, то мы, ударніцы-калгасніцы і работніцы соўгасаў, абавязаны паказаць, што і гэтым спосабам мы працаваць не развучыліся. Ударнымі брыгадамі мы з сярпом у руках прымем усе меры да таго, каб своечасова і поўнасцю сабраць наш ураджай.

Асобае значэнне мае пры ўборцы зернавых ПРАЦА КАМІСІЙ АБО ІНСПЕКЦЫЙ ПА ЯКАСЦІ. Кожная калгасніца павінна быць першым застрэльшчыкам барацьбы ЗА ЗАХАВАННЕ ЎРАДЖАЮ, работы камісіі па якасці. Мы абавязаны арганізаваць ахову нашага ўраджаю. Няхай нашы дзеці, нашы слаўныя піонеры арганізуюць дазоры ўраджаю, няхай комсамольцы і моладзь ствараць дазорныя вышкі. Няхай нашы дзеці і мы самі арганізуем асобныя брыгады для таго, каб падабраць у час уборкі з поля кожны колас.

Мы абавязаны прасачыць кожны крок, па якому праходзіць наш ураджай, каб ні на полі, дзе адбывалася ўборка, ні па дарозе, па якой перавозілі снапы, ні каля малатарні, дзе гэтыя снапы абмалочваліся, НЕ БЫЛО СТРАЧАНА НІ АДНАГО ЛІШНЯГА КОЛАСА, НІ АДНАГО ЛІШНЯГА ЗЕРНЯЦІ.

4. У барацьбе за лён

Таварышы, нядаўна сакратар ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО пісаў аб тым, што мы ў Беларусі дрэнна працуем над ільном, у выніку чаго ў нас атрымліваецца мала валакна і яно дрэннай якасці. Мы павінны прызнацца, што гэтае ўказанне т. Гікало з'яўляецца зусім правільным. Мы ў Совецкай Беларусі маем магчымасць атрымаць лепшы лён, чым атрымліваем. Можна здаваць дзяржаве лён лепшай якасці, чым мы здавалі ў мінулыя гады. Можна атрымаць ад ільну большыя выгады, чым мы атрымлівалі. Лён—гэта наша золата, лён наш хлеб, наша багацце. Гэта залежыць выключна ад нашай работы над ільном. Мы, калгасніцы, у першую чаргу нясем адказнасць за прарыў з ільном, бо больш за ўсё над ільном працуе жанчына-калгасніца. Урокі мінулых гадоў кажуць зусім выразна, што лён дрэннай якасці мы атрымлівалі таму, што яго не ўбіралі своечасова, не расцілалі і не падымалі, таму што нядбайна адносіліся да гэтай важнейшай культуры. Таварышы, мы абавязаны рашуча пакончыць з гэтымі ганебнымі і невыгоднымі для нас адносінамі да ільну. Нам сорамна, што ў Совецкай Беларусі лён горшы за лён іншых рэспублік.

У мэтах большага кантролю за ходам работы па ільну, мы абавязаны вылучыць у кожным буйным калгасе, у кожнай калгаснай брыгадзе АДКАЗНАГА ПА ІЛЬНУ ІЛЬНАВОДА, ЯКІ ВЕДАЕ ГЭТУ СПРАВУ І ЗДОЛЯЕ ЯЕ АРГАНІЗАВАЦЬ. Мы абавязаны своечасова і добраякасна прапалоць лён, арганізаваць своечасовае церабленне, сушку і хаванне ільну, сурова караць злачынцаў, калі яны дапусцяць сцілку і мочку неабмалочанага ільну, абмалоцяць яго на зернавых малатарнях, нядбайна будуць наглядаць за лёжкай і мочкай ільну.

Мы абавязаны своечасова падрыхтаваць ільнацерабільныя машыны і навучыцца правільна карыстацца гэтымі машынамі. Мы абавязаны на час праполкі і церабленя ільну прымацаваць да пэўных участкаў пастаянныя звенні калгаснікаў і калгасніц. Мы абавязаны падрыхтаваць у кожным калгасе дастатковую колькасць трэбняў для ачосу ільну. Мы абавязаны вывучаць справу ільнаводства. Сартаванне ільну трэба пачынаць у час яго церабленя. Апрацоўку ільну трэба пачаць яшчэ да зімы. Лён мы павінны пачаць апрацоўваць у жніўні і скончыць яго апрацоўку да Окцябрскіх свят. Гэту задачу мы можам і абавязаны выканаць. Мы абавязваемся біцца за высокі нумар ільну, не ніжэй дзесятага. Мы лічым для сябе справай гонару здаць дзяржаве цалкам, своечасова і высокай якасці лён.

5. Па выкананню абавязацельстваў перад дзяржавай

Таварышы, мы ўсе добра ведаем, што кожны грамадзянін у краіне Советаў павінен з гонарам выканаць свае абавязкі. НАШ ПЕРШЫ І СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК—ГЭТА ВЫКАНАННЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА ЗДАЧЫ ДЗЯРЖАВЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ПРАДУКТАЎ. Вось чаму, змагаючыся за ўборку, мы абавязаны яе арганізававаць так, каб зараз-жа ў час уборкі выканаць свае абавязкі перад дзяржавай.

Першае і лепшае сена проста з сенажаці мы абавязаны здаць на прыёмачныя пункты. Усе зернавыя мы абавязаны зараз-жа абмалаціць для таго, каб неадкладна здаваць іх на пункты Заготзярно. БУЛЬБУ З ПОЛЯ—У ВАГОН—вось чым мы павінны кіравацца пры здачы бульбы.

Таварышы, правядзем здачу сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве па-ўдарнаму. Здамо дзяржаве самую лепшую прадукцыю, здамо сухое, ачышчаное зярно, сухую, уборыстую бульбу, лепшае мурожнае сена.

Адначасова мы просім урад, каб да загатовак былі праверaны ўсе прыёмшчыкі на пунктах прыёмкі хлеба, бульбы, ільну і жалезнай мятлой вычышчаны пралезшыя туды кулакі і ворагі.

Выконваючы нашу першую запаведзь па здачы сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве, мы ў той-жа час не забудзем таго, каб ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СЯБЕ ДОБРЫМ НАСЕННЕМ, ДЛЯ ЧАГО ПРЫ ЎБОРЦЫ ВЫБЯРЭМ ЛЕПШЫЯ ЎЧАСТКІ

Фото МАЗЕЛЕВА.

-мантаж маст. КЛІМЕНКО.

злёта—тав. Чарвякоў легацыя: Сенненскага, йскага раёнаў.

ДЛЯ АДБОРУ НАСЕННАГА МАТЭРЫЯЛА, засыпаўшы пасля хлебаздачы зярно і будзем правільна сачыць за тым, каб яно не сапрэла, каб забяспечыць пасевы азімых і пасеўную кампанію будучай вясны на 100 проц. чыстым і ўсхожым насеннем.

6. Па жывёлагадоўлі і сілаванню

Таварышы, наш вялікі правадыр т. Сталін на XVII з'ездзе партыі адзначыў, што мы ўсе ў калгасах і соўгасах дрэнна працуем у галіне жывёлагадоўлі. Між тым, справа жывёлагадоўлі—гэта вялікая справа, якая мае вялікае значэнне ў нашай народнай гаспадарцы і ад становішча якой у значнай меры залежыць барацьба за высокі ўраджай, за большэвіцкія калгасы і за лепшы дабрабыт рабочых і калгаснікаў. Вось чаму мы абавязаны па-баявому ўзяцца за выкананне закліка т. Сталіна, каб дабіцца рашучага пералому ў справе жывёлагадоўлі.

Наша першае слова да кіраўнікоў калгасаў, соўгасаў, да брыгадзіраў—жывёлаводаў. Таварышы, вы абавязаны прыняць усе меры, каб забяспечыць нашу жывёлагадоўлю ў дастатковай колькасці і высокай якасці кармамі. Трэба абавязкова стварыць моцную кармавую базу ў кожным калгасе і кожным соўгасе. Мы абавязаны па-гаспадарску ўбраць і захаваць кораньплоды, мы абавязаны ўбраць цалкам усе лугі. МЫ АБАВЯЗАНЫ ЎЖО ПРЫСТУПІЦЬ ДА ЗАКЛАДКІ СІЛАСНЫХ ЯМ, СІЛАСНЫХ ТРАНШЭЙ, і да набіўкі сіласных вежаў з тым, каб забяспечыць кармамі не толькі аграмаджанае стада, але і жывёлу асабістага карыстання калгаснікаў і рабочых соўгасаў. Вы ў першую чаргу адказваеце за тое, каб забяспечыць поўнае пакрыццё ўсіх кабыл, кароў, свінаматак і авец.

Наша другое слова па гэтаму пытанню да скотніц, цялятніц, даярак і свінарак. Таварышы, не дапушчайце ў вашай працы ні малейшай неахайнасці. Прыміце ўсе меры да таго, каб захаваць увесь маладняк, падвоіць удой кароў, павялічыць і палепшыць адкорм жывёлы.

Таварышы калгасніцы, мы заклікаем вас усіх берагчы сваіх цялят, разводзіць больш свіней, авечак, курэй, гусей. У кожнай калгаснай хаце, калі яна хоча быць заможнай, павінна быць многа птушак і жывёлы.

Таварышы калгасніцы, асаблівую ЎВАГУ МЫ АБАВЯЗАНЫ ЗВЯРНУЦЬ НА КАНЯ ў калгаснай гаспадарцы. Конь—гэта верны дапаможнік трактара. Конь—гэта верны прыяцель кожнага калгаса і кожнага соўгаса. А між тым, мы павінны прызнаць, што ў большасці выпадкаў жанчына-калгасніца стаіць у баку ад барацьбы за моцнага, здаровага, сытага калгаснага каня, лічачы чамусьці гэта выключна мужчынскай справай. Гэта няправільна, кожная калгасніца абавязана займацца канём і змагацца за каня, змагацца за павелічэнне і вырошчванне маладняка. Месца калгасніцы ўсюды. Мы, жанчыны калгасніцы і работніцы соўгасаў, звярачаемся з ударным заклікам да комсамольцаў і піянераў—узняць работу па шэфству над канём, узняць барацьбу за калгаснага і соўгаснага каня.

7. Аб працы і быце калгасніц

Таварышы, мы ўсе ведаем, што калгасы Совецкай Беларусі ў гэтым годзе з большым поспехам завяршылі веснавую сяўбу, дзякуючы таму, што ў КАЛГАСАХ УЗНЯЛАСЯ ВЯЛІКАЯ СІЛА КАЛГАСНІЦ-ЎДАРНІЦ, ЯКІЯ ІДУЦЬ НАГА Ў НАГУ, ПЛЯЧО Ў ПЛЯЧО З КАЛГАСНІКАМІ-ЎДАРНІКАМІ. Аднак, мы ведаем, што яшчэ не ўсе калгасніцы і работніцы соўгасаў з'яўляюцца ўдарніцамі. Не ўсе яшчэ працуюць чэсна, добрасумленна. Ёсць яшчэ нямала такіх, якія адлыньваюць ад работы пад усялякімі прычынамі, а мы, калгасніцы-ўдарніцы, часта спакойна да гэтага адносімся, часта паддаемся сваёй жаночай жаласлівасці. Часта бывае так, што нашым добрым сэрцам, нашай слабасцю карыстаюцца лодыры, гультаі і людзі, прывыкшыя есці смачна і карыстацца чужой працай, якія не ходзяць на работу, а патрабуюць сабе дапамогі і т. д. Гэта няправільна. Гэтыя з'явы толькі разбураюць калгас. Таму МЫ АБАВЯЗАНЫ АБВЯСЦІЦЬ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ЎСІМ ГУЛЬТАЯМ І ПРАГУЛЬШЧЫКАМ. Мы павінны браць у прыклад лепшых калгасніц, у якіх у хаце малыя дзеці, але якія ў той-жа час не маюць ні аднаго прагулу. Мы абавязаны дабівацца стопроцантнага выхаду на работу.

У той-жа самы час мы абавязаны ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ТАГО, КАБ ПАЛЕГЧЫЦЬ ДОЛЮ ПРАЦОЎНАЙ ЖАНЧЫНЫ. Наш першы абавязак заключаецца ў тым, каб у кожным калгасе, у кожным соўгасе былі арганізаваны яслі і дзіцячыя пляцоўкі. Яслі і пляцоўкі—гэта тое, што вызваляе жанчыну ад хатніх клопатаў, што дае жанчыне прымаць удзел у працы калгаса. Гэта ўжо даказана, і толькі той, хто скрыта хоча шкоды калгасу, хто з'яўляецца праціўнікам добрай арганізацыі працы ў калгасах, хто хоча сарваць арганізацыйнае ўмацаванне калгасаў, той творыць перашкоды ў справе арганізацыі ясляў і пляцовак.

Мы абавязаны павесці рашучую барацьбу супроць усіх праціўнікаў ясляў і пляцовак. У той-жа час мы, КАЛГАСНІЦЫ, І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЎДАРНІЦЫ, АБАВЯЗАНЫ БОЛЬШУЮ ЎВАГУ ЗВЯРНУЦЬ НА СПРАВУ АРГАНІЗАЦЫІ ЯСЛЯЎ І ІХ РАБОТУ. Нам не трэба чакаць, каб нехта арганізаваў яслі, каб нехта загатовіў усё для ясляў. Мы абавязаны ПА ПРЫКЛАДУ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ І СОЎГАСАЎ АРГАНІЗАВАЦЬ ЯСЛІ ЎЛАСНЫМІ СІЛАМІ. Мы можам і абавязаны знайсці добрую хату, зрабіць ложкі, знайсці начынне. Мы можам і абавязаны дастаць у калгасах і ў саміх сябе неабходныя прадукты—хлеб, малако, яйкі, масла.

Такім чынам, У СПРАВЕ АРГАНІЗАЦЫІ ЯСЛЯЎ, ГАЛОЎНАЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС САМІХ. Яслі да ўборачнай кампаніі ў кожным калгасе і соўгасе—вось наш баявы заклік.

Таварышы, мы абавязаны прыняць усе меры для таго, КАБ УЗНЯЦЬ ЯКАСЦЬ НАШАЙ ПРАЦЫ, КАБ ЗРАБІЦЬ НАШУ ПРАЦУ БОЛЬШ ПРАДУКЦЫЙНАЙ. Для гэтага нам неабходна навучыцца справе кіравання і правільнага карыстання сельска-гаспадарчымі машынамі. Для гэтага нам трэба рашуча знішчыць існуючую часта ў калгасах абязлічку і ўраўнілаўку ў рабоце. Нам трэба ад працы скопам, без уліку пераходзіць да такой працы, дзе праца кожнай калгасніцы ўлічваецца. Сярод нас ёсць розныя людзі. Ёсць ударніцы, ёсць і гультайкі, ёсць аматары патрапаць языком, а ёсць калгасніцы, якія працуюць сапраўды пабольшэвіцку. Чаму яны павінны працаваць кучай і дзяліць заработак пораўну. Мы абавязаны зрабіць так, каб кожная з нас атрымлівала дзённае заданне і адведзены на дзень участак. Гэтым кожная з нас яшчэ больш будзе зацікаўлена сваёй работай і будзе знішчана ўраўнілаўка.

8. Наша слова да працоўных аднаасобніц

Мы, ударніцы - калгасніцы і работніцы соўгасаў, звярачаемся да ўсіх працоўных аднаасобніц—заўтрашніх калгасніц з заклікам—чэсна і добрасумленна выканаць свае абавязкі па праполцы, уборцы ўраджаю і здачы дзяржаве сельгаспрадукцыі. Гэта дапаможа вам, таварышы, уступіць у калгас, бо адзіны шлях для кожнага сумленнага аднаасобніка—гэта шлях уступлення ў калгасы. Звароту ад калгаснага ладу да аднаасобнай гаспадаркі быць не можа.

Мы са свайго боку абяцаем вам сваю таварыскую дапамогу як у справе ўступлення ў калгасы, арганізацыі новых калгасаў, так і ў справе ператварэння вас з аднаасобніц ва ўдарніц - калгасніц. Мы чакаем ад вас, што многія з вас ужо гэтую ўборку будуць праводзіць у якасці калгасніц і што наступаючы год мы сустрэнем адзінай калгаснай сям'ёй.

9. Заваюем пяршынства ў спаборніцтве з Заходняй вобласцю

Таварышы, наша БССР спаборнічае з Заходняй вобласцю. На нашым з'ездзе прысутнічала дэлегацыя калгасніц Заходняй вобласці. Пажадаем-жа ім новых поспехаў у барацьбе за заможнае і культурнае жыццё і дамо адначасова моцнае слова, што мы будзем змагацца па-большэвіцку за выкананне прынятых намі самаабавязацельстваў, і што першынства, заваяванага намі ў спаборніцтве з Заходняй вобласцю, мы не здамо.

10. Заваюем права рапарту тав. Сталіну

Таварышы! Мы стаім напярэдадні ўборкі. Уборка вырашыць вынікі ўсяго года—наш ураджай, нашы даходы. Мы заклікаем усіх ударніц і ўсіх калгасніц, работніц соўгасаў, усіх працоўных аднаасобніц змагацца за права і гонар паслаць восенню нашаму вялікаму правадыру т. Сталіну рапарт аб тым, што БССР у ліку самых першых выканала свае абавязацельствы перад краінай.

Наперад-жа, на барацьбу за большэвіцкі ўраджай, за выкананне вялікага, мудрага закліку правадыра—зрабіць калгасы большэвіцкімі, калгаснікаў заможнымі!

Няхай жыве наша вялікая партыя большэвікоў!

Няхай жыве ленінскі ЦК!

Няхай жыве наш вялікі і мудры правадыр тав. Сталін!

КАЛГАСНІЦЫ-ЎДАРНІЦЫ, РАБОТНІЦЫ СОЎГАСАЎ!

ПІШЫЦЕ, ЯК У ВАС ВЫКОНВАЮЦЦА САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ЗЛЁТА!

У гасцях у работніц фабрыкі „Комунарка“

16-га чэрвеня частка дэлегатак злёта калгасніц-ударніц наведала кандытарскую фабрыку „Комунарка“.

Трыкутнік фабрыкі арганізаваў сустрэчу з музыкай. Ударніцы і ўдарнікі прывіталі дэлегатак крыкамі: „Няхай жывуць лепшыя ўдарніцы соцыялістычных палёў“. На гэта калгасніцы адказалі: „Няхай жывуць лепшыя ўдарніцы фабрык і заводаў“.

Тут-жа каля фабрыкі ў садзе адбыўся мітынг. На мітынгу выступала майстар чырвонасцяжнага дражэйнага цэха тав. Мядведзява, якая расказала работніцам пра вопыт работы лепшых ударніц. Ад калгасніц-ударніц Аршанскага раёна выступала Наталевіч Марфа, Слуцкага раёна—Туравец Волька, Капыльскага—Падгалая, Старобінскага—Бандаравец Галя. Яны заверылі работніц, што скончаць уборку без страт, у тэрмін і здадуць дзяржаве збожжа з першага абмалоту.

Пасля гэтага калгасніцы разышліся па цэхах. У дражэйным цэху тав. Мядзведзява азнаёміла дэлегатак з улікам соцспаборніцтва і якасці прадукцыі. Інспектар па якасці Ермалюнава з калгаса „Вольная праца“, Аршанскага раёна, расказала работніцам, як яна змагалася ў час пасеўнай і праполкі за якасць палявых работ. Тав. Бязлюдава—інспектар па якасці калгаса „Чырвоная змена“, Аршанскага раёна, гаварыла, што дзякуючы пільнасці інспекцыі на якасці, яны дабіліся лепшых вынікаў на сяўбе і праполцы, добрасумленных адносін калгасніц да сваёй работы.

Дэлегатка злёта Гарбун Ольга—лепшы звеннявод калгаса „Праца“ (зона Ветрыканскай МТС).

Асабліва дэлегаткі зацікавіліся індывідуальнай здзельшчынай, якая ўкаранена на фабрыцы.

Пасля агляда цэхаў, дэлегатак запрасілі ў сталоўку, дзе яны за шклянкай кавы дзяліліся ўражаннямі аб фабрыцы.

Дэлегаткі Слуцкага раёна ўнеслі прапанову, каб, раз'ехаўшыся дамоў, укараніць у сваіх калгасах па прыкладу работніц індывідуальную здзельшчыну. Таксама скарыстаць вопыт фабрыкі і арганізаваць насценныя штодзёнкі ў кожнай брыгадзе і звяне.

Дэлегатка калгаса „Чырвоныя Навасёлкі“, Аршанскага раёна, Піткевіч унесла прапанову ад аршанскай, слуцкай, старобінскай і капыльскай дэлегацый — заключыць соцдагавор з работніцамі фабрыкі „Комунарка“. Калгасніцы абавязаліся своечасова і без страт убраць ураджай, арганізаваўшы пільную ахову яго; датэрмінова—выканаць збожжапастаўкі, добрасумленна, у тэрмін выканаць усе абавязкі перад дзяржавай. Работніцы абавязаліся выканаць і перавыканаць прамфінплан, выпускаць добрую якасць прадукцыі. Ход спаборніцтва будзе асвятляцца на старонках журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“.

Перад уходом кожная дэлегатка атрымала падарунак, зроблены рукамі ўдарніц фабрыкі—каробку цукерак высокай якасці.

Спевам „Інтэрнацыянала“ скончылася таварыская гутарка. Дэлегатаў праводзілі з музыкай да аўтобуса. Задаволеныя, яны звярнуліся на злёт, каб працягваць дзелавую работу. Е. Э.

Менск.

Буду пільна сачыць за якасцю ўборкі

У час пасеўнай я працавала з плугам. Як старшыня інспекцыі па якасці, я пільна сачыла, каб не рабілі агрэхаў.

Перад праполкай мы склікалі жанчын, гаварылі, як трэба палоць, каб ні аднаго пустазелля не пакінулі. Папярэдзіла ўсіх, каб чыста палолі.

Растлумачальная работа дала свае вынікі. Калгасніцы добрасумленна працавалі на полі. Але быў факт, калі я заўважыла, што Кузняцова Каця пакінула свірэпіцу і ўжо сабралася ісці да хаты. Я яе вярнула назад, паказала на дрэнную работу. Яна тут-жа прызнала сваю віну і свой загончык прапалола чысценька.

У час уборкі абавязваюся пільна сачыць, каб ні адно зерне не засталося на полі. Буду змагацца за своечасовую здачу дзяржаве збожжа з першага абмалота. Сваім калгасніцам раскажу аб злёце, навучу іх яшчэ лепш працаваць.

Дэлегатка злёта
Бязлюдава Вікця.

Калгас „Чырвоная змена“
Аршанскага раёна.

Працаваць так, як Пармон Вера

Лепшым памочнікам брыгадзіра ў калгасе „Авангард“, Магільнянскага сельсовета, Уздзенскага раёна, з'яўляецца Пармон Вера. Яе брыгада была перадавой на пасеўнай, а таксама і на праполачнай. Другая брыгада пад кіраўніцтвам Пармон Веры ўзяла на буксір чацвертую брыгаду, дзе была выяўлена недабраякасная праполка. Калі адсутнічаў брыгадзір у другой брыгадзе, Пармон Вера забяспечвала поўны выхад звенняў на работу і добрую якасць праполкі. Гонар кожнага брыгадзіра—падрыхтаваць сабе такога памочніка, як Пармон Вера. Вольпава.

Удзельніцы злёта з Аршанскага, Слуцкага, Старобінскага і Капыльскага раёнаў і работніцы фабрыкі „Комунарка“! Пішыце, як выконваеце ўзятыя вамі абавязацельствы па соцспаборніцтву ў час злёта!

ВЕСТКІ З КАЛГАСАЎ

Падрыхтавалі адказных па ільну

Палітаддзел Крычаўскай МТС арганізаваў трохдзённыя курсы на 57 калгасніц — адказных за догляд ільну ў калгасах. На вечары, прысвечаным выпуску курсаў, у сваіх выступленнях калгасніцы гаварылі, што яны цяпер упэўніліся, што толькі з навуковымі ведамі можна атрымаць вялікія перамогі ў развіцці калгаснай гаспадаркі.

Калгасніцы Пліснічэўская і Баркунова, з калгаса „Красата", запэўнілі, што атрыманыя веды на гэтых курсах яны ўжывуць на практыцы і забяспечаць добрую якасць ільновалакна.

— Раней мы мелі дрэнную якасць ільновалакна, — кажуць яны,—бо не ўмелі добра даглядаць лён. Ніколі мы не палолі ў сваёй індывідуальнай гаспадарцы, таму ў трасце было шмат травы, што зніжала якасць валакна. Мы не ведалі, што трэба сартаваць трасту па гатунках, колеру, а таксама, што нельга мяшаць трасты з розных участкаў, як канюшынішча, ляды і г. д. Слалі трасту тоўстым слоем і яна няроўна вылежвалася. Цяпер мы гэтага больш не дапусцім. Скарыстаем веды, якія атрымалі на курсах.

— На курсах нас навучылі самаму неабходнаму ў апрацоўцы ільну—трапаць, вязаць яго і г. д.,—кажа Іўкіна, з калгаса "Звязда", Палоніцкага сельсовета.

— Летась лён у нас пасеялі на балоце,—кажа Далецкая, з калгаса „Свабода".—Гэта пастараўся так зрабіць Стручкоў—былы бандыт, які кіраваў раней нашым калгасам. За глебу і догляд ільну ніхто не адказваў. Лён раскрадалі, расцягвалі. Сёлета мы гэтага не дапусцім. Нас многаму навучыў палітаддзел. У гэтым годзе мы пад лён добра апрацавалі глебу і выбралі добрыя ўчасткі. Будзем змагацца за высокаякаснае ільновалакно, каб першымі здаць яго дзяржаве.

В. Жураўлёва.

Гамолка Улляна

Гамолку Улляну ведаюць не толькі ў калгасе „III Інтэрнацыянал", але і ва ўсім Жыткавіцкім раёне. Гэта вельмі энергічная жанчына, аддана ўсёй душой рабоце калгаса. Гамолка 4 разы прэміравана. І гэта невыпадкова.

Зімой Гамолка арганізавала брыгаду з 15 жанчын на лесазагатоўкі. Рэзалі лес і вывозілі яго. План брыгада перавыканала, за што Гамолка атрымала прэмію.

Гамолка была раней непісьменнай, але адчувала, што ёй трэба вучыцца, бо гэта перашкаджае ў рабоце. Яна пом. брыгадзіра па жанрабоце, яна арганізоўвае жанчын. Як-жа яна можа быць непісьменнай?

У час падрыхтоўкі да 8 сакавіка Гамолка заключыла соцдагавор з памочнікам начальніка палітаддзела па жанрабоце т. Троцкай на лепшае правядзенне вясновай сяўбы і праполкі. У гэтым дагаворы Гамолка абавязалася ліквідадаць да першага мая сваю непісьменнасць і ўласнай рукой напісаць ліст да т. Троцкай.

2-га мая, на сходзе калгасніц праверылі выкананне соцдагавора і аказалася, што Гамолка выканала ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы. Не забыла яна ўласнай рукой напісаць ліст да т. Троцкай, які быў зачытан на гэтым сходзе.

У калгасе „III інтэрнацыянал" добра наладжана масавая работа сярод жанчын, бо парторг т. Дуброва вельмі многа дапамагае, а таксама і старшыня Кірбай і брыгадзір Страха Пракоп. У брыгадах выпускаюцца штодзёнкі, якія бязлітасна ганьбяць гультаёў і папулярызуюць работу лепшых ударнікаў.

Л.

Жыткавіцкі р.

Адрамантавана дарога

Калгас „Чырвоны бобар", Крупскага раёна, знаходзіцца на невысокім месцы. У дажджы па дарогах ні прайсці, ні праехаць. Балота, вада мучылі людзей і коней. Гэта адбівалася на рабоце ў час пасеўнай і хлебапастаўвак

Так далей не магло быць. На сходзе калгаснікі пастанавілі адрамантаваць дарогу.

Пачалася работа. Жанчыны і дзяўчаты з рыдлёўкамі кожны дзень выходзілі на дарогу, капалі канавы, рабілі насып. Лепшымі ўдарнікамі былі Лішкова Анюта і Валодзька Дуня, але былі і зрыўшчыцы, гультаі, як Лішкова Н. А. і Лішкова А. Д.

Дзякуючы ўдарнай рабоце адрамантаваны ўсе дарогі—даўжынёй 2 кілометры.

Новыя дарогі дапамогуць нам паспяхова выканаць усе сельскагаспадарчыя работы і хлебапастаўкі ў час. Цяпер коні не будуць тапіцца ў балоце, калгаснікам будзе лепш хадзіць на поле.

Талачынскі Міхась.

Калгасніцы—варашылаўскія стралкі

Калгасніцы Піткевіч Грыпіна і Піткевіч Юля вельмі метка страляюць і нядаўна яны атрымалі знакі варашылаўскіх стралкоў.

У калгасе ўсе дзяўчаты члены АСО, уваходзяць у караульную каманду па ахове калгаснай маёмасці. Часта можна іх убачыць ля свірнаў з вінтоўкамі. Э.

Калгас „Чырвоныя Навасёлкі", Оршанскага раёна.

Варашылаўскія стралкі з галгасаў Зоны Оршанскай МТС—Крыштафовіч, Апукава, Яноўская.

Новы універсальны магазін

У прыгожым трохпавярховым будынку на Совецкай вуліцы размясціўся менскі універсальны магазін. 28 мая, у першы дзень адкрыцця магазіна, яго наведала звыш 10.000 пакупцоў. Універмаг мае 16 аддзяленняў, 12.000 назваў розпага асартымента тавараў.

На першым паверсе—парфюмерны, папяровы і музычны аддзелы. Тут спажывец можа выбраць мандаліну, гітару, балалайку, пласцінкі для патэфона і іншыя музычныя рэчы. Тут-жа размешчан вялікі аддзел гаспадарчых рэчаў і пасуды, куды больш усяго спяшаюцца жанчыны. Прымусы, самавары, эмаляваная пасуда, скавародкі — вось што вабіць хатніх гаспадынь.

На другім паверсе—так званы дзіцячы свет. Ён размешчан асобна ад усіх іншых аддзелаў. Пры ўваходзе стаяць дзве фігуры — піонера-барабаншчыка і гарніста, якія заклікаюць да работы і барацьбы. Тут-жа стаяць маленькія столікі, на якіх расстаўлены розныя цацкі для забаў дзяцей. На паліцах — вялікі выбар дзіцячых тавараў: абутак, коўдры, світры, джэмпры і інш. Шмат цацак. Дзіцячы аддзел мяжуецца з багатым аддзелам універмага—галантарэйным. Тут можна купіць кішаньковы і ручны гадзіннік, бялізну, трыкатаж, шоўкавыя і шарсцяныя джэмпры, майкі, саколкі, світры.

На трэцім паверсе размешчаны мануфактурны і абутковы аддзелы. Тут вялікі выбар самай рознастайнай мануфактуры, каляровыя туфлі, чаравікі, балеткі, сандалі. Тут-жа і аддзел гатовай вопраткі.

У магазіне ёсць кафе, куды пакупец можа зайсці перакусіць.

Штодзённы зварот магазіна складае 80.000 руб. Зараз адчыніўся аддзел сукна, шоўку і меблі. Асартымент тавараў будзе пашырацца за кошт мануфактуры, меблі, галантарэі. Універмаг мае запас тавараў на чатыры месяцы.

Менскі універмаг з'яўляецца аднэй з культурнейшых гандлёвых устаноў БССР. У кожным аддзеле ёсць каса, кантрольны стол. Работнікі магазіна культурна і далікатна абыходзяцца з пакупцамі. Тут-жа ёсць спецыяльны радыё-вузел і бюро даведак.

Магазін адчынен з 10 гадзін раніцы да 8 гадзін увечары.

К.

Фото Я. М. САЛАВЕЙЧЫКА

Аддзяленне гатовай бялізны ў новым універсальным магазіне.

Весела і культурна адпачываюць дзеці

Пасёлак Ратамка стаў цялер сталым месцам адпачынку дзяцей. З кожным годам дзіцячыя дамы адпачынку, раскінутыя на тэрыторыі Ратамскага сельсавета, пашыраюцца, абзаводзяцца гаспадаркай. З кожным годам паляпшаецца становішча дзіцячых дамоў адпачынку, бо клопаты партыі і ўраду аб дзецях, аб будучых будаўніках соцыялізма вельмі вялікія. Ні адна краіна ў свеце так не клапоціцца аб пролетарскіх дзецях, як Совецкі Саюз.

У піонерскія лагеры Менска ў гэтым годзе выехала пяцітысячная армія піонераў, школьнікаў ударнікаў вучобы, якія размеркаваны ў 10 лагерах.

Адным з лепшых з'яўляецца піонерскі лагер імя 10-годдзя піонерскай арганізацыі пры Менскім таварыстве „Прыхільнік дзяцей". З кожным годам лагер пашыраецца. Калі ў мінулым годзе за змену праходзіла праз лагер 90—95 дзяцей, то ў гэтым годзе прапускная здольнасць дайшла да 150 дзяцей. 25 га мая выехала першая партыя дзяцей-ударнікаў вучобы.

Весела і культурна дзеці адпачываюць. Харчы спажыўныя. Кормяць пяць разоў у дзень. За трынаццаць дзён прабывання ў лагеры, дзеці ў сярэднім прыбавіліся ў вазе на 1,5 кгр. Увесь дзень дзеці праводзяць у лесе за рознымі гульнямі, дзе часта бываюць і гутаркі. У дрэннае надвор'е гульні пераносяцца ў клуб, з вялікай верандай. Тут дзеці гуляюць у даміно, шашкі, шахматы, більярды. Дзеці таксама займаюцца ў гуртках: авіяпланерным і Чырвонага Крыжа.

Адзін раз у 6-дзёнку дзецям паказваюць кінофільм. Выпусцілі першы нумар насценгазеты і радыё газету. Вельмі добра прайшоў вечар самадзейнасці.

У лагеры ёсць абсталяваны медгабінет, у якім працуе сталы доктар і медсястра.

За чатыры гады вельмі вырас піонерскі лагер. Пабудаваны некалькі дамоў з паасобнай, кухняй, клуб, ёсць гаспадарчыя будынкі.

У пакоях—прыгожы інвентар, нікеліяваныя ложкі, з пружыннымі матрацамі, добрая пасцельная бялізна, ёсць і ванны для дзяцей. Чысгыя карпусы, частая змена бялізны ахоўваюць лагер ад інфекцыйных хвароб.

У лагеры ёсць харчовая база—10 свіней з узорным свінарнікам, там-жа і кухня для прыгатавання кармоў. Ёсць тры каровы, два кані, 6 га зямлі, агарод і невялікі сад. Гэта забяспечыла лагер дабавачнымі малочнымі прадуктамі, тлушчам, мясам, гародніпай і бульбай.

М. ВОЛЬНЫ.

Менск.

OD SOCHY DO ELEKTRYCZNOSCI

Kto nie pamięta starej wsi carskiej na Białorusi przed 14 tu laty?

Była to wieś odzwierciedlająca wszystkie własności kapitalistycznego rozwoju gospodarki rolnej. Polityka rolna rządu carskiego, który również dobrze służył obszarnikowi okresu pańszczyźnianego, jak i ich młodemu pokoleniu—obszarnictwu skapitalizowanemu, zostawiła szczególne ślady na wsi na Białorusi.

Rząd carski, prowadząc na Białorusi politykę rabunku kolonjalnego i strasznego ucisku narodowego pracujących mas białorusinów, żydów i polaków, wcale nie dbał o rozwój gospodarczy kraju, o rozbudowę przemysłu miejscowego.

Co mieliśmy przed 14 laty na wsi? Około $^3/_4$ chłopstwa było w stanie nieustannego borykania się z nędzą i ruiną.

Najlepszym zobrazowaniem tego stanu rzeczy jest polska wieś Kuryłowo na Witebszczyźnie.

Tam za czasów przedrewolucyjnych panowali obszarnicy Sajenko i Starżemecka. Wynagradzali oni swych braci—polaków—krewnych po 40 dziesięcin najlepszej ziemi.

Był kułak Prejs—polak i o parę kilometrów na obszarniczej ziemi harowali parobcy polacy Stiepanow i Chowański.

Obszarnik Sanejko przez swego agienta kułaka Prejsa wysysał ostatnią ktew nie tylko u parobków, lecz i u całej okolicznej biedoty wsi Kuryłowo.

***

Po równej szosie Smoleńskiej, gdy podjeżdżacie do wsi Kuryłowo, wam się wydaje, że jesteście w pobliżu samego miasta. Wabi was światło lampek elektrycznych polskiego kolektywu im. Łańcuckiego, Rudnickiej r. wiejskiej.

Po obu stronach drogi rozległo się kilka kolektywów, do których wlała się biedota i średniacy z całej okolicy Kuryłowo.

A przecież nie tak dawno, gdy zajeżdżano do tej wsi, ogarniała was rozpacz, widząc tę nędzę i zubożenie przeważnej większości ludności zaścianku. Żaden z biedaków tej wsi nie miał własnego chleba. Szli na zarobki do miasta. Nosili wodę, rąbali drzewo witebskim kupcom i przedsiębiorcom. Chodzili w łapciach, łachmanach.

A teraz? Jak tylko powstał kolektyw z roku na rok rosło uzbrojenie techniczne ko.ektywu.

Traktor, silnik dyzelowy—to już nie nowość dla Kuryłowa.

***

W roku 1931 z inicjatywy przewodniazącego kolektwu tow. **Michiejewa** kolektyw zelektryfikował pierwszą brygadę. W każdej chacie

Wanda Przybytko—najlepsza szturmówka z polskiego kolektywu „Wolność", Niegorelskiej r. w., rejonu Dzierżyńskiego.

kolektywnika zapaliła się lampka Iljicza. Do 1929 roku nie było tu żadnej większej szkoły, a dziś mamy polską 4-latkę i białoruską 7-latkę. W kolektywie im. Łańcuckiego żyją zgodnie i pracuią szturmowo kolektywnicy polacy, białorusini. W drodze sumiennej pracy, wzajemnej pomocy krzepnie internacjonalizm proletarjacki.

— **Kraj nasz obfituje w bohaterów. Mamy bohaterów lotników, mamy mężnych czeluszkinowców, chemy być godnemi, by na polach naszego kolektywu byli również bohaterzy rolnictwa socjalistycznego** — oświadczają kolektywnicy.

Kolektyw im. Łańcuckiego z roku na rok krzepnie. Elektryczność popłynęła po drucie do młocarni, do obory. Zbudowano stolarkę, zbudowano nową kuźnię, nowe obory. Na miejscu, gdzie niegdyś stały krzyże, wzniosła swe ramiona wieża silosowa. Zbudowano 10 piwnic dla warzyw i ogrodowizny. W r. ub. kolektyw im. Łańcuckiego zebrał dobry urodzaj, a w tym roku zamierza zebrać jeszcze wyższy.

W roku ubiegłym każdy sumienny kolektywnik otrzymał na pracodzień przeszło 3 kg., a w tym roku postanowiono walczyć o to, by na każdy pracodzień wypadło nie mniej niż 8—10 kg.

Łapcie odeszły w przeszłość. Każdy kolektywnik teraz ma dobre buty chromowe, porządny kostjum, buciki, kalosze i t. d.

Tak, były biedak Krawczyk do rewolucji harował u obszarników, a obecnie w kolektywie jest brygadjerem brygady budowlanej. Dzieci jego uczą się w szkole i zaopatrzone są w ubranie i nie odczuwają żadnych niedostatków.

Albo weźmiemy byłego parobka Stiepanowa. Przedtym on nic nie miał, a teraz wybudował sobie dom, ma krowę, owce, świnie. A zajrzyjcie do niego do chaty—pełne umeblowanie.

***

Kolektyw im. Łańcuckiego pierwszy w r. wiejskiej wykonuje na czas wszystkie kampanje polityczno-gospodarcze i świeci przykładem wśród okolicznych kolektywów.

Współzawodnictwo socjalistyczne, szturmowość stało się jedyną metodą dając zwycięstwo kolektywu. Obecnie kolektyw zakończył sianokos i na czas wykonał obowiązki względem państwa proletarjackiego. Do sprzętu urodzaju kolektyw jest całkowicie gotowy. Odremontowano 4 kosiarki, nabyto 3 nowe, naprawiono wszystek inwentarz do sprzętu.

***

Pola jare zwiastują dobry urodzaj, żyto, schylając w podmuchach wiatru swe kłosy, przypomina o niezbędności przygotowania się do żniw.

Dziś nie odczuwa się szarpania i zdenerwowania w pracy. Zastąpiła je pewność i świadoma dyscyplina. W kolektywie funkcjonują 3 ogródki dziecięce. Wychowawczynie są odpowiednio przygotowane i posiadają 3-letni staż pracy praktycznej.

Dzieci mają poddostatkiem zabawek. Kobieta w kolektywie jest całkowicie zwolniona od kłopotów domowych.

Od chwili rozpoczęcia sprzętu kolektyw zorganizuje stołówkę bezpośrednio w polu.

Polski kolektyw im. Łańcuckiego szturmowo walcząc o wysoki urodzaj, na podstawie szerokiej pracy masowo-uświadamiającej zapewni sobie jeszcze szybsze posuwanie się naprzód, walcząc o zamożne życie kolektywnika, o bolszewickie kolektywy.

Ordyński.

אין קאָלווירט האָבן זיי דערפילט די ווירקלעכע קראפט

וועגן זיי, וועמען דער אָקטיאבער האָט באפרייט אוּן וועמען די ריכטיקע לענינישע נאציאָנאלע פאָליטיק האָט באהעפט מיט דער פראָדוקטיוער פרייַדיקער ארבעט אין די קאָלווירטן, דערציילן מיר היינט אין דעם טאָג פון דער באפרייונג פון ווייס-רוסלאנד פון די ווייספאָליאקן.

מיר זעען זיי היינט אין אונדזערע קאָל-ווירטן געזונטע, לעבנסלוסטיקע, אפ פאר-שיידענע באצירקן פון דער קאָלווירטישער ארבעט. זיי זיינען אפ דער מילכיקס-פערמע, פירן אָן מיט בריגאדעס, מיט רונגען אוּן אפילע מיט גאנצע קאָלווירטן.

צוזאמען מיט ווייסרוסישע, פוילישע, ליטווישע קאָלווירטניצעס, אין אייניק דערלעכער אינטערנאציאָנאלער פאמיליע, בויען זיי זייער גליקלעכן, זאטן אוּן קול-טורעלן לעבן.

דאָ אין קאָלווירט זיינען אפ אייביק פאראקערט די מעזשעס, וואָס פלעגן אָפ-טיילן „מיין שטיקל ערד" פון „דיין שטיקל ערד". דאָ אין קאָלווירט ווערט ארויסגע-ריסן די ווילדגראָז, וואָס רויבט אָפ די גערעטעניש בא דעם קאָלווירטניק, אויך די ווילדגראָז, וואָס דער נאָמען אירער איז: נאציאָנאלע אָפגעגרענעצטקייט אוּן שאָוויניזם.

דער קאָלווירט האָט אפ אייביק באגראָבן דעם הונגער, דאלעס אוּן נויט, מיט וואָס די פארפלוכטע קאפיטאליסטישע אָרדענונג פלעגט מיט דער בריטער האנט „שפּייזן" דער אמאָליקער דערשלאָגענער פינצטערער ייִדישער האָרעפאשניצע.

וואָר איז נאָכ ניט געווען א באלעבאָס איבער דער ייִדישער האָרעפאשניצע? דער גויר מיטן גראָבן קארק, וואָס האָט גע-צויגן דעם לעצטן קליאָק פון דעם אָרעמאן, דער ראָו אוּן דער גאבייַ, וואָס האָבן געלערנט דער פרוי: „אונטערטעניק זיין דעם גוויר", דער פריסטאָו אוּן אוריאדניק, וועלכע פלענן בא דער אָרעמער האָרע-פאשניצע פאר די שווערע שטייַערן צונעמען דאָס לעצטע קישן פון אונטערן קאָפּ. ס'פלעגט זיך געגוג אויסשטיין די פרוי פון דעם מאן אירן, וואָס פלעגט אין דער פינצטערניש זיינער מיינען, אז די ווייב איז א קנעכט בא אים.

עס קאָן נאָכ ביז היינט ניט פארגעסן די ייִדישע האָרעפאשניצע די יאָרן פון שוידער אוּן בלוט, וועגן די „אויסלייזער" פון ווייסרוסלאנד — די ווייספאָליאקן אוּן נאָכ זיי די געשיקטע באנדעס פון בולאק-באלאכאָוויטש—האָבן זיך ארייַנגעריסן אין ייִדישן שטעטל — אין קאָוטשיצ אוּן פעטשישטשע, אין קאפאָטקעוויטש אוּן פאָבאָלאָוע, האָבן אויסגעשאָכטן אלט אוּן יונג, כאָרעוו געמאכט די שטעט-לעך.

* * *

אוּן היינט?

די בריגאדע, וווּ שיפרע קאצ איז דער פארטרעטער פון בריגאדיר, טראָגט דעם ערן-נאָמען פון כ' דימיטראָוו. שיפרע איז שוין 6 יאָר א קאָלווירטניצע אין קאָלווירט „1-טער מיי" (סלוצק). ביזן ארייַנטרעטן אין קאָלווירט האָט זי אויך

שיפרע פערקאל—די בעסטע שלאָגערן פון קאָלווירט „1-טער מיי" (סלוצק).

געארבעט אפ איר שטיקל ערד. מאָגער איז געווען איר שטיקל ערד. אויסגעכוי-שעכט איז שיפרע געווען.

די עמעסע קראפט אירע האָט זי דער-פילט אין קאָלווירט.

ס'איז וואָרמעסצייט, מע פירט א הויכע פאָרלעזונג פון א ציַיטונג. אלע קאָלווירט-ניצעס אוּן קאָלווירטניקעס הערן זיך צו מיט דער גרעסטער נייַגעריקייט, ווי שיפרע טייַטשט פאר זיי אָפ די ציַיטונג, וועלכע זי לייענט אפן קאָל. שיפרע קאצ לערנט אפ א בריף פון די קאָלווירטניצעס, ווי צו אָרגאניזירן א ריכטיקן זיי-פארקער. שיפרע קאצ איז איינע פון די סאמע אק-טיווסטע אָנטיילנעמער, איך קריַיז, וווּ מע דערלערנט דעם 17-טן פארטיי-צוזאמענפאָר.

דער סאמע בעקאָוועריקסטער פאָסטן שיפרעס איז—רעדאקטער פון דער בריגאדע-ציַיטונג. דאָ האָבן זיך באזונדערס בויליעט אנטפלעקט די אָרגאניזאטוריש פייַקייַטן פון דער נעכטיקער פאריאָגטער האָרעפאשנער פרוי. איר האָט געדארפט הערן, ווי שיפרע קאצ אגיטירט דעם מאן אירן, וועלכער ארבעט בא איר אין בריגאדע, אז „שרייַבסטו ניט איך ציַיטונג, ביסטו גאָר קיין מענטש ניט". אוּן, אז שיפרע קאצ נעמט אין אירע פעסטע קאָל-ווירטישע הענט די פאָר פערד אוּן לאָזט זיך אקערן די קאָלווירטישע פעלדער—ברענט בא איר דאָס די ארבעט אין די הענט...

* * *

אונדזער טייַערע באשקע—אזוי רופט מען איר אין קאָלווירט „1-טער מיי" (סלוצק).

פארוואָס האָט באסיע פערקאל פארדינט אזא נאָמען בא די קאָלווירטני-צעס? וועלכע מיילעס פארמאָגט זי עס? די בעסטע מיילע אירע איז, וואָס זי איז א פרעמירטע שלאָגערן, אוּן פון דאנען נעמען זיך שוין אלע איבעריקע מיילעס-אָט דאָ, צווישן די בייטן, ראָסאדע פון קרויט אוּן בוריקעס, צווישן די שפעקטן, „טעפליצעס" מיט אוגערקעס, פאָמידאָרן אוּן קלובניק וועבן זיך בא באסיען דער-פינדערישע גראָסן, ווי בעסער אויס-האָדעוועט די אָדער יענע קולטור, אוּן דערלבער רופט מען איר אין קאָלווירט „אונדזער אגראָנאָם באסקע". אוּן נאָך גרעסער זיַינען באסיעס פארדינסטן, ווי אָן איניציאָטער פון סאָצגעוועט אוּן שלאָג-לערייַ. אלייַן די בעסטע שלאָגערן דינט זי אלס ביישפיל פאר אלע איבעריקע קאָל-ווירטניקעס אוּן קאָלווירטניצעס. אוּן דע-ריבער איז אזוי בריט פאנאנדערגעוויקלט דער סאָצגעוועט אין דער בריגאדע, וווּ עס ארבעט באסיע פערקאל.

כייַקינע, פון קאָלווירט „קאָלאָס", מאָליעווער ראיאָן. דער קאָלווירט אירער האלט די איבערגאנג-פאָן פון די איזשאָר-סקער ארבעטער. כייַקינע האָט אויך א כיילעק אין דער פאָן. זי האָט עס באוויזן מיט איר שלאָגלעריש ארבעט אין בריגאדע, וווּ זי איז דער געהילפ-בריגאדיר.

די נעכטיקע פעריאָגטע פרוי איז היינט בארימט אין קאָלווירט, ווי די גרעסטע אפיקוירעסטע. אין בריגאדע, וווּ כייַקינע איז א געהילפ-בריגאדיר, ווייס מען ניט פון קיין פראָגולן אוּן ניט פון קיין שלעכטער קוואליטעט.

פרענקלעך—א קאָלווירטניצע אין אינטערנאציאָנאלן קאָלווירט „זאכאָדי", רעטשיצער ראיאָן. זי ארבעט אפ דער פערמע. מע האָט איר פרייַער געפונ-פוילערן. עס קאָן זיַין, אז זי האָט זיך פרייַער טאקע אביסל צוגעפוילט. נאָר זאָל אימעצער פרווון אפ איר היינט זאָגן א קרומען וואָרט. בא קיינעם וועט זיך דער מויל ניט עפענען, ווייַל פרענקלעך האָט פון אירע קעלבער אויסגעהאָדעוועט אלע ביי אייַנע, ווייַל די קראנקע קעלבער זיַינען בא פרענקלעך אויך געזונט געוואָרן, אוּן אז מע האָט געדארפט, האָט זי בא די קראנקע קעלבער נעכט גענעכטיקט אין שטאל, קאָמפדעסן זיי געלייגט.

* * *

אסאכ האָבן מיר אויסלכע קאָלווירטניצעס אין די ייִדישע אוּן אינטערנאציאָנאלע קאָלווירטן פון ווסער.

אינעם יאָנטעוו פון דער באפרייונג פון ווייסרוסלאנד פון די ווייספאָליאקן דארף זיַין דאָס וואָרט פון יעדער קאָלווירטניצע—נאָכמער אקשאָנעסדיק פירן דעם קאמפ פאר א הויכער גערעטעניש אָן קיין שום פארלוסטן, צושטעלן דער מעלוכע די בעסטע טווייַג, פעסטיקן די שוצפייַקייט פון לאנד אוּן טאָגטעגלעך זאָרגן וועגן אונדזער רומפולער רויטער ארמיי.

ש. גורוויטש.

СЯМІГАДОВЫЯ МУЗЫКАНТШЫ

Маленькі смычок вымушан падпарадкавацца сямігадовай скрыпачцы. Музыка плаўна разлівалася па пакоі. Усе прысутныя былі нібы зачараваны майстэрствам выканання, чыстатой і мяккасцю гукаў. Радуська выконвала на скрыпцы этюд Вольфарта.

Маленькай Ладыгінай Радусі было 6 год, калі яна паступіла ў музшколу. Празаймаўшыся толькі адзін год, яна пачала ўжо выконваць вельмі складаныя рэчы, праяўляючы выключныя здольнасці ў музыцы. У Радуські тонкі музычны слух, яна вельмі добра і хутка засвойвае матэрыял, а таксама мае ўсе фізічныя дадзеныя для музыкі.

— Гэта дзяўчынка, безумоўна, будзе ў свой час велічынёй у музыкальным свеце,—так адзываецца аб ёй загадчык школы т. Герман.

Праз пару хвілін да раяля падышла кучаравая дзяўчынка—Лідачка Бессмертная. Ёй таксама ўсяго 7 год. Але ручкі ўпэўнена бегаюць па клавіатуры, адразу адчуваеш правільнасць выканання. Лідачка выконвала такія складаныя рэчы, як „Жаваранак" Чайкоўскага, санату Бэтховена і інш. За першы год вучобы Лідачка таксама паказала выключныя здольнасці ў музыцы, вельмі добрую ўспрымальнасць матэрыяла.

З вялікім шоўкавым бантам на грудзях прышла ў школу сямігадовая віаланчэлістка Вайншток Роза. Віаланчэль больш за віаланчэлістку, але Роза навучылася ўжо добра ёю кіраваць. Каштоўна тое, што акрамя музыкальных здольнасцяй, у яе ёсць яшчэ і надзвычайная любоў да музыкі. Дзякуючы гэтаму Розачка робіць вельмі вялікія поспехі. Яна з асаблівым майстэрствам і пачуццём выконвае „Бродячий музыкант" Бэтховена, „Мінцэтку" Моцарта, санату Ромберга і інш.

У канцы дзеці сыгралі трыо: Ладыгіна—на скрыпцы, Бяссмертная—на раялі, Вайншток—на віоланчэлі. Усе былі захоплены майстэрствам самага маладога трыо ў свеце, якім разам толькі 21 год. І сапраўды, дзе ў якой краіне свету ёсць такія мажлівасці, любоў, клопаты і дапамога з боку партыі і ўраду ў выяўленні і развіцці маладых талантаў, як у краіне будуючагася соцыялізма.

У школе ёсць яшчэ здольныя дзеці, не толькі гэта тройка. Вось 10-гадовая Марозава Лёля мае вельмі добрыя здольнасці да ігры на скрыпцы. Бацька яе рабочы сталовай арцелі імя Крупскай. Гапановіч Сусана мае ўсе дадзеныя для поспехаў у галіне музыкі. Ужо зараз яна грае этюды Крэйцэра, канцэрт Вівальдзі і інш. Нельга не адзначыць і 12-гадовую Жыў Эму, якая грае на раялі. У школе займаецца ўсяго два гады, а перайшла ўжо на чацверты курс. Грае складаныя рэчы Баха, Шумана, у яе вялікія здольнасці.

Фрайман Міра—віаланчэлістка, Фідлон Міля—піяністка—10 год, Немзер Хаім—10 год—скрыпач, таксама вельмі таленавітыя дзеці, маюць надзвычайна добрыя музыкальныя здольнасці.

Усе гэтыя юныя таланты атрымоўваюць стыпендыю НКАсветы 50 руб. у месяц.

* * *

Грыміць музыка ў класах. Звонкія, радасныя галасы дзяцей перамешваюцца з гукамі скрыпак, віаланчэлеў, піянін. Пасля асноўных заняткаў у школе, дзеці сюды збіраюцца вучыцца музычнаму майстэрству. Усяго ў Менскай музычнай школе каля 500 дзяцей ад 7 да 17 год. З іх больш 16 проц. дзяцей рабочых, астатнія дзеці спецыялістаў, служачых.

Супроць мінулагаа года школа значна выросла ў галіне лепшай пастаноўкі вучобы, дысцыпліны, забяспечанасці музыкальнымі прыладамі. Раней музыкальных інструмантаў зусім не было, зараз набылі 118 скрыпак (усе дзеці скрыпкамі забяспечаны), набылі таксама 18 віаланчэляў.

Фото Мазелева, фото-монтаж маст. Віера.

Злева-направа віолончэлістка Міра, скрыпачкі — Марозава Лёля і Гапановіч Сусанна.

Нядаўна ў школе закончаны экзамены. Амаль няма дзяцей з нездавальняючымі адзнакамі. Гэты факт гаворыць сам за сябе.

Зараз у школу пададзена ўжо больш тысячы заяў, а прыём яшчэ не адкрыт. Такі небывалы наплыў дзяцей у музшколы кажа не толькі аб жаданні дзяцей вучыцца, але галоўным чынам аб культурным росце насельніцтва, а таксама аб палепшанні работы школы. Пры такім наплыве Наркамасветы БССР прыдзецца падумаць аб пашырэнні памяшкання школы, якое, да рэчы кажучы, і зараз непрыстасавана да вучобы.

Неабходна ўмацоўваць камуністычнае выхаванне падрастаючага пакалення, выяўляць юныя таланты, дапамагаць ім расці і развівацца.

Ганна.

Менск.

Правільная нацыянальная палітыка, правадзімая нашай партыяй, забяспечвае магутнае развіццё пролетарскіх мастацкіх талантаў.

На барацьбу за высокі ўраджай

Перад намі ў сучасны момант партыяй і совецкай уладай пастаўлена вельмі вялікая і адказная задача ў справе павышэння ўраджайнасці. Выкананне гэтай адказнай задачы магчыма толькі пры тых умовах, калі кожным калгасам і соўгасам будуць своечасова праводзіцца ўсе тыя агротэхнічныя мерапрыемствы, ад якіх залежыць павышэнне ўраджайнасці. Сюды ўваходзіць добрая апрацоўка глебы, унясенне мінеральных угнаенняў, радковая і своечасовая сяўба, догляд за пасевамі, барацьба са шкоднікамі селькай гаспадаркі і своечасовая ўборка ўраджаю без страт.

Цёплае надвор'е, якое ўстанавілася, спрыяе для з'яўлення шкоднікаў. Асабліва вялікае з'яўленне іх можна чакаць на гародніх і ільняных раслінах. Таму трэба неадкладна прыняць усе захады да знішчэння шкоднікаў. Кожны калгас і соўгас павінен атрымаць у райземаддзеле хімікаты, неабходныя прылады, а таксама інструктаж, як змагацца са шкоднікамі.

З гародніх шкоднікаў магчыма чакаць нападу капусніка беляка, капустажэра, звычайнага рапсавага пільшчыка. Таму пры з'яўленні вусеніц адразу трэба зрабіць апырскванне гародніх раслін рашчынаю парыскай зелені з вапнаю (на 12 літраў вады трэба браць 13—15 грам зелені і 26—30 грам свежаапаленай вапны), або джыпсінам (на 12 літраў вады 25—30 гр. джыпсіна).

Калі пачнецца кладка яечак матылямі, трэба аглядаць ніжнюю частку лісцяў капусты і раздушваць яечкі. Для гэтай мэты можна мабілізаваць піонераў і школьнікаў. Таксама ў агародзе трэба знішчыць усё пустазелле—месца кладкі яечак.

На ільняных пасевах можна чакаць з'яўленне ільнянога чарвяка. Пры з'яўленні яго трэба зрабіць апыленне ільну парыскай зеленню з вапнаю (на 1 частку зелені 8—10 частак свежаапаленай вапны), або джыпсінам. Акрамя апылення можна апырскваць пасевы рашчынаю парыскай зелені (на 12 літраў вады трэба браць 12 грам зелені і 24 грамы свежаапаленай вапны).

Акрамя барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі вялікую ролю ў справе атрымання высокага ўраджаю адыгрывае і своечасовая ўборка ўраджаю, асабліва збожжавых культур (жыта, ячменю, аўса і ільну). Само паспяванне збожжавых раслін разбіваецца на некалькі перыядаў: малочны, васковы і поўная спеласць. Убіраць збожжавыя культуры трэба ў час васковай спеласці.

Пры васковай спеласці зерне мае жоўты колер, ломіцца без трэску, таксама мае жоўты колер і сцебель.

Пераход ад васковай спеласці да поўнай пры цёплым надвор'і праходзіць на працягу вельмі кароткага тэрміна (3—4 дні). Пры поўнай спеласці салома становіцца крохкаю і лёгка ломіцца. Пры ўборцы такога збожжа вельмі шмат зерня будзе высыпацца на зямлю, што прыносіць вялікую страту. Таму ў кожным калгасе і соўгасе ўжо зараз павінны быць вылучаны лепшыя паляводы, якія-б за тыдні паўтара пачалі назіраць за паспяваннем збожжа.

У першую чаргу трэба ўбіраць тое збожжа (участкі), колас якога мае ўжо значны нахіл (да 45°). Шмат яшчэ калгаснікаў і рабочых соўгасаў прытрымліваюцца памылковай думкі, што вага зярняці павялічваецца пасля васковай спеласці. Вопыты навуковых станцый паказваюць, што пасля васковай спеласці зерне не прыбывае ў вазе.

Уборку збожжа трэба праводзіць у самы хуткі тэрмін, не больш, як на працягу аднаго тыдня. Чым хутчэй убярэм збожжа, тым больш захаваем ураджай ад страт.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на якасць уборкі. Усе ўборачныя машыны павінны быць загадзя падрыхтаваны.

Пры машыннай уборцы збожжавых культур страты можна звесці да самых мінімальных памераў шляхам прыстасавання да лабагрэяк, жняярак збожжаўлавіцеляў, скарыстання ў кожным калгасе і соўгасе конных і ручных грабель.

Збожжаўлавіцель за дзень можа сабраць да 250—280 *кг* збожжа. У большасці калгасаў будуць ужывацца жняяркі-самаскідкі. На іх збожжаўлівацелі ўстанаўліваюцца ў выглядзе скрынкі, памерам 110 *см* даўжыні 30 *см* шырыні. Вышыня скрынкі не павінна перавышаць 10 *см*. Такая скрынка робіцца з дошак (12 *мм* таўшчыні), або ліставога жалеза (0,5 *мм* таўшчыні). Каб збожжаўлавіцель не прагінаўся, знізу павінна быць жалезная паласа шырынёю да 22 *мм*.

Скрынка зверху зачыняецца рамкаю з жалезным абручом. На рамку нацягваецца драцяная сетка з дзіркамі (15 *мм* даўжыні і 8 *мм* шырыні). Да бруска платформы прымацоўваюцца адным канцом кранштэйны. З другога канца кранштэйны прарэзваюцца ўдоўж і загінаюцца ў выглядзе кальца. У прарэзную частку ўстаўляецца валік скрынкі, а потым у кольцы штыф. Такі збожжаўлавіцель робіцца да жняяркі-самаскідкі, якія выраблюцца Люберэцкім заводам. Пры рабоце жняяркі трэба мець адну запасную скрынку, каб у час напаўнення скрынкі збожжам, можна было яе замяніць новай.

Кожны калгас яшчэ да ўборкі збожжа абавязкова павінен зрабіць збожжаўлавіцелі. Трэба дабіцца таго, каб у час уборкі былі поўнасцю знішчаны страты збожжа.

Аграном Маркавец.

„Лічыць важнейшай задачай партыйных і совецкіх арганізацый у 1934 годзе разгортванне канкрэтных мер барацьбы са стратамі ва ўсіх працэсах работы (хлебаўборка, скіртаванне, перавозка і захаванне)"...

(З пастановы чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б).

780

Фото МАЗЕЛЕВА, фото-мантаж маст. ВІЕРА

На здымку—юныя дараванні Менскай музычнай школы. Справа—налева: БЯССМЕРТНАЯ Ліда, ЛАДЫГІНА Радуся, ВАЙНШТОК Роза (матэрыял гл. на стар. 16).

ДА ВЕДАМА РАБСЕЛЬКОРАК

Ліcьма ў рэдакцыю трэба дасылаць абавязкова з ука-нем прозвішча, імя і імя па бацьку і дакладнага ад-у, бо інакш яны не могуць друкавацца і не могуць ць пасланы для расследвання і рэагавання.

алі рабселькорка не хоча падпісваць сваё прозвішча турнале, яна можа падпісаць допіс інакш, але для рэ-дакцыі неабходна мець дакладны адрас, прозвішча, імя і імя па бацьку кожнай рабселькоркі.

Рэдакцыя просіць паведаміць свае дакладныя адрасы т. т. Драздовай А., Сядзінкінай, Буйко К., Верхінай, Голуб, Нямірскай, Берман М., Матэумавай, Слаўковіч Стэфы, Гаянковай, Заяц Таццяны.

ыданне ЦК КП(б)Б

Нам. адказнага рэдактара З. Пясцікава

Адрас рэдакцыі: Менск. Совецкая 63, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 998. У ліку 13.405 экз. Мелітаріт № 2961.

Здана ў набор 4-VII—34 г. Падпісана да друку 10 VII—34 г. У нумары 2¼ арк., 144168 друк. зн.